

Артыстка Л. Ф. Аляксеева у ролі Віялеты ў оперы Дж. Вердзі „Травіята". Пастаноўка Вялікага Дзяржаўнага ордэна Леніна Тэатра Оперы і Балета БССР. Фото Дынкіна

ПРАЧЫТАЙЦЕ ГЭТЫЯ КНІГІ

М. І. Калінін

ПЫТАННІ КОМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Масква, Дзяржпалітвыдат. 1940. 52 стар. Цана 50 кап. Тыраж 100 тысяч экз.

У зборніку пяць выступленняў М. І. Калініна, прысвечаных асноўным пытанням комуністычнага выхавання працоўных. Змест: Прамова на II Усесаюзнай нарадзе кіраўнікоў кафедр марксізма-ленінізма ВНУ 4 ліпеня 1940 г. Прамова на Тбіліскім агульнагарадскім сходзе прадстаўнікоў інтэлігенцыі—акадэмікаў, інжынераў, урачоў, артыстаў, мастакоў 27 мая 1940 г. Прамова на нарадзе ЦК ВЛКСМ з сакратарамі абкомаў ВЛКСМ па рабоце сярод школьнай моладзі і піянераў 8 мая 1940 г. Прамова на нарадзе навучаючыхся 8, 9 і 10 класаў поўных сярэдніх школ Бауманскага раёна горада Масквы 7 красавіка 1940 г. Прамова на нарадзе настаўнікаў-выдатнікаў гарадскіх і сельскіх школ, скліканай рэдакцыяй «Учительской газеты» 28 снежня 1940 г.

Н. К. Крупская

СОВЕЦКІМ ДЗЕЦЯМ

г. Калінін, Обллітвыдат. 1940. 98 стар. Цана 1 руб. 10 кап. Тыраж 4000 экз.

Старэйшы член большэвіцкай партыі, верны саратнік Леніна і Сталіна Н. К. Крупская з'яўлялася буйнейшым практыкам і тэарэтыкам народнай асветы. У гэты зборнік увайшлі артыкулы Н. К. Крупскай да совецкіх дзяцей, навучаючыхся школ па важнейшых пытаннях піонерска-комсамольскага і школьнага жыцця.

Артыкулы размеркаваны па наступных раздзелах: За выдатную вучобу і дысцыпліну ў школе. Аб дружбе рэбят усіх нацыянальнасцей. Дзецям аб піонерскай арганізацыі. Будзем грамадскімі працаўнікамі; будзем берагчы соцыялістычную ўласнасць. Дзецям аб кнізе і бібліятэцы. Водгукі дзяцей на смерць Н. К. Крупскай. Кнізе прадпаслана біяграфія Н. К. Крупскай і паведамленне ад ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб смерці Надзежды Канстанцінаўны.

А. С. Макарэнка

ЛЕКЦЫІ ДЛЯ БАЦЬКОЎ

Пад рэдакцыяй Н. Макарэнка і В. Калбаноўскага. Масква, Вучпеддзяржвыдавецтва. 1940. 120 стар. Цана 1 р. 25 к. у пераплёце. Тыраж 50.000 экземпляраў.

А. С. Макарэнка (1888—1939)—выдаючыйся педагог—наватар, аўтар выдатных твораў—«Педагагічная паэма», «Флагі на башнях» і «Кніга для бацькоў». Увайшоўшыя ў кнігу 8 лекцый, прачытаныя А. С. Макарэнка па радыё, асвятляюць наступныя надзвычай важныя пытанні выхавання дзяцей: агульныя ўмовы сямейнага выхавання, аб бацькоўскім аўтарытэце, аб дысцыпліне, аб значэнні гульні ў жыцці дзіцяці, аб працоўным гаспадарчым выхаванні, аб прывіцці дзіцяці культурных навыкаў і аб палавым выхаванні.

Лекцыям дадзена прадмова прафесара В. Калбаноўскага—аб педагагічнай дзейнасці А. С. Макарэнка і значэнні яго ідэй ў развіцці комуністычнага выхавання нашага маладога пакалення.

А. А. Люблінская

СЯМЕЙНЫЯ АДНОСІНЫ І ІХ УПЛЫЎ НА ДЗЯЦЕЙ

Ленінград. 1940. 48 стар. Цана 1 руб. (Ленінградскі гарадскі інстытут удасканалення настаўнікаў. Гутаркі з бацькамі аб выхаванні школьніка ў сям'і. Вып. 6). Тыраж 2500 экз.

На канкрэтных прыкладах, узятых з гарадскога жыцця, аўтар паказвае дадатны і адмоўны ўплыў сям'і на выхаванне дзіцяці. У кніжцы чатыры раздзелы: 1. Выхаваўчае значэнне поўнай сям'і (дружная мнагалюдная сям'я, як фактар правільнага і ўсебаковага выхавання дзяцей). 2. Адзінае дзіця ў сям'і (Тыповыя «метады» сямейнага выхавання дзіцяці-адзіночкі). 3. Разводы і ўплыў іх на дзяцей (Дзіця ў разбуранай сям'і. Жыццё дзіцяці з радзіцелем-адзіночкай. Сям'я з нянародным дзіцем). 4. Сям'я і школа (Аб ролі педагогаў і дзіцячага калектыва ў выхаванні дзіцяці). Кніга напісана папулярна.

М. Н. Слабадзінская

ДАСУГ ШКОЛЬНІКА Ў СЯМ'І

Масква „Молодая гвардия" 1940. 72 стар. Цана 1 р. 40 к. у пераплёце. Тыраж 75 тыс. экз.

Каротка і папулярна асвятляюцца асноўныя пытанні, звязаныя з вольным часам дзіцяці і падростка, на якія трэба ў першую чаргу звярнуць увагу бацькоў. Ахарактарызаваўшы задачы комуністычнага выхавання дзяцей і ўказаўшы на неабходнасць увагі да іх дарослых, аўтар каротка растлумачвае, як забяспечыць разумны адпачынак дзіцяці, чым і як заняць яго вольны час. Прыведзены яркія прыклады чулых, уважлівых адносін да дзяцей з боку Маркса, Леніна, Сталіна, Горкага. Закрануты пытанні аб рабоце мацярэй-грамадскіх работніц з «чужымі» дзецьмі, аб значэнні ў справе арганізацыі вольнага часу дзяцей сумесных, узгодненых намаганняў сям'і і школы.

Бюджэт ордэнаноснай Беларусі

У канцы сакавіка ў Мінску, у сталіцы нашай рэспублікі была склікана V Сесія Вярхоўнага Совета БССР. Сесія разгледзіла пытанні аб зацвярджэнні дзяржаўнага бюджэта Беларускай ССР на 1941 г. і аб зацвярджэнні Ўказаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, прынятых у перыяд паміж сесіямі і падлягаючых зацверджанню Вярхоўнага Совета БССР.

З выключнай дзелавітасцю на Сесіі было абмеркавана пытанне аб дзяржаўным бюджэце рэспублікі на 1941 год. І ў дакладзе намесніка Народнага Камісара Фінансаў БССР тав. Катлярова Г. П. і ў садакладзе старшыні бюджэтнай камісіі Вярхоўнага Совета БССР—дэпутата Маліна В. М. і ў выступленнях дэпутатаў па гэтаму пытанню было ярка паказана, як дзякуючы нястомным клопатам партыі і ўрада і лепшага друга беларускага народа таварыша Сталіна з года ў год, з месяца ў месяц расце наша ордэнаносная рэспубліка. Асабліва пераканаўча аб гэтым гаворыць той факт, што валавая прадукцыя соцыялістычнай прамысловасці БССР за прайшоўшы 1940 год павялічылася ў параўнанні з 1939 годам на 15 процантаў.

Велізарныя змены адбыліся за прайшоўшы год у заходніх абласцях БССР. Пачалі працаваць на поўную магутнасць сотні прадпрыемстваў, якія пры польскіх панах былі выведзены са строю. Сотні тысяч дзяцей і дарослых, якія раней маглі толькі марыць аб асвеце, зараз займаюцца ў совецкіх школах і вышэйшых навучальных установах. У заходніх абласцях створаны 1 100 дамоў соцыялістычнай культуры, адкрыта 337 бібліятэк. Надзвычай яркі прыклад, які асабліва сведчыць аб сталінскіх клопатах аб працоўных, прывяла ў сваім выступленні на Сесіі дэпутат О. А. Сысоева:

— Бюджэт польскага ўрада па ахове здароўя на 1939 год складаў па Пінскай вобласці 42 тысячы рублёў, а ў 1940 годзе совецкая ўлада адпусціла на ахову здароўя па Пінскай вобласці 11 мільёнаў рублёў.

За прайшоўшы год у БССР праведзена вялікая работа па далейшаму ўздыму соцыялістычнай сельскай гаспадаркі, па падняццю ўраджайнасці, па асушэнню балот, па росту заможнасці калгаснікаў.

Тав. Катляроў далажыў Сесіі, што па папярэдніх даных даходная частка бюджэта 1940 года перавыканана на 107 780 тысяч рублёў.

Сесія зацвердзіла бюджэт БССР на 1941 год па даходах у суме 2 153 185 тысяч рублёў, па расходах у суме 2 139 172 тысячы рублёў, гэта значыць, што даходы перавышаюць расходы на 14 013 тысяч рублёў.

Калі ўзяць бюджэт любой капіталістычнай краіны, то аграмаднейшая частка яго даходаў ідзе ад усё павялічваючыхся падаткаў з насельніцтва. У нас-жа асноўную частку даходаў складаюць адлічэнні ад прыбыткаў дзяржаўных гаспадарчых арганізацый і падатак з абарота. Гэтыя паступленні раўняюцца 61,5 процанта ўсіх даходаў дзяржаўнага бюджэта БССР.

З гэтага відаць якое велізарнае значэнне мае для выканання даходнай часткі бюджэта работа кожнага наркамата, прадпрыемства, магазіна і кожнага працоўнага паасобку. Зусім правільна аб соцыялістычным бюджэце сказаў паэт—ордэнаносец Лебедзеў-Кумач:

— Бюджэт—это кровное дело всех граждан.
Шахтер и танкист, машинист и поэт,
Колхозник и лётчик—пусть трудится каждый,
Чтоб был исполнен народный бюджет!

Вялікае значэнне для выканання бюджэта мае работа нашых калгасаў, соўгасаў, МТС. Цэнтральны камітэт ВКП(б) і совецкі ўрад праяўляюць нястомныя клопаты аб калгасным сялянстве. Калгаснае сялянства Беларусі, згуртаванае вакол партыі Леніна—Сталіна, адкажа на гэтыя клопаты значным палепшаннем сваёй работы і выкананнем сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. У гэтай справе павінны заняць перадавое месца калгасніцы—жанчыны соцыялістычнай вёскі.

Асаблівасць бюджэта нашай рэспублікі, як і бюджэта ўсяго Совецкага Саюза, заключаецца ў тым, што ўсе расходы ідуць на патрэбы насельніцтва, на яшчэ большае ўмацаванне нашай радзімы. На соцыяльна-культурныя мерапрыемствы прадугледжана выдаткаваць 1 363 319 тысяч рублёў, што складае 63,8 процанта агульнага аб'ёма ўсіх расходаў бюджэта. З іх на асвету асігнуецца 870 676 тысяч рублёў, на ахову здароўя—408 966 тысяч рублёў. На фінансіраванне народнай гаспадаркі асігнуецца 23,1 процанта ўсяго бюджэта. На ўтрыманне дзіцячых садоў прадугледжваецца па бюджэту 49,1 мільёна рублёў або на 30,5 процанта больш, чым у 1940 годзе. У дзіцячых садах рэспублікі будзе выхоўвацца 49 400 дзяцей. Расходы на культурнае будаўніцтва па заходніх абласцях рэспублікі ўзрастаюць на 24,5 процанта. Наогул расходы па дзяржаўнаму бюджэту на 1941 г. у параўнанні з 1940 годам узрастаюць на 4,4 процанта. У выкананні бюджэта асаблівае значэнне мае беражлівае расходванне дзяржаўных сродкаў, стражайшы рэжым эканоміі. У мінулым годзе ў БССР было дапушчана самавольнае павышэнне зарплаты работнікам Наркамфіна БССР і іншых устаноў. За самавольнае павышэнне зарплаты работнікам Наркамфіна БССР і запушчанасць штатнай справы ў фінансавых органах рэспублікі рашэннем урада знят з работы Народны Камісар Фінансаў БССР тав. Сцяпанаў.

У бюджэце прадугледжана змяншэнне ўпраўленчых расходаў на 22,8 мільёна рублёў.

На сесіі была праяўлена выключная актыўнасць з боку дэпутатаў у абмеркаванні пытання аб дзяржаўным бюджэце. З трыбуны Сесіі выступілі і жанчыны-дэпутаты тт. Пятроўская, Сысоева, Герасімчык, Федасюк. Іх прамовы былі выключна дзелавыя і яркія. Гэта яшчэ адзін паказчык таго, як пад кіраўніцтвам партыі растуць і выхоўваюцца жаночыя кадры.

Беларускі народ і разам з ім і працоўныя жанчыны прыкладуць усе сілы к таму, каб выканаць поўнасцю дзяржаўны бюджэт, памятаючы, што ад гэтага яшчэ больш узмацнее наша ордэнаносная рэспубліка—неад'емная частка вялікага Совецкага Саюза.

БССР імені ІНА

У поўнай гатоўнасці сустрэлі вясну

Надышла чацвертая большэвіцкая вясна Трэцяй Сталінскай Пяцігодкі. Ад таго наколькі дзейсна мы падрыхтаваліся да сяўбы залежыць поспех будучага ўраджаю.

З практыкі мінулых год мы ўпэўнілася, што трэба пачынаць рыхтавацца да вясны яшчэ з восені. І мы так зрабілі. Рыхтаваліся старанна, сачылі, каб нічога не было ўпушчана і ў апошнія дні не было спешкі.

Наш калгас з'яўляецца адным з буйнейшых у раёне. У ім налічваецца 6 брыгад. На агульным сходзе калгаснікаў пастанавілі ўсю падрыхтоўку да веснавой сяўбы праводзіць па-брыгадна. Склалі план. За кожнай брыгадай замацавалі цягавую сілу, інвентар.

Хутка паміж брыгадамі разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае правядзенне рамонта сельскагаспадарчага інвентара. У гэтым спаборніцтве пяршынства заваявала брыгада № 4, якой кіруе тав. Крывец. Яна першай скончыла рамонт. Калгас у цэлым закончыў рамонт інвентара к 20 лютага.

Мы яшчэ зімой вывезлі ў поле гной. Там яго склалі ў бурты, перамяшаўшы з торфам, добра ўтрамбавалі, каб не сапсаваўся.

Акрамя гною падрыхтавалі многа мясцовага ўгнаення. Аднаго толькі торфу загатовілі на ўгнаенне 4800 вазоў. Сабралі 18 цэнтнераў курынага памёту і 50 цэнтнераў попелу. Пры зборы попелу і памёту асабліва добра праявіла сябе стаханаўка з чацвертай брыгады—звенявая Агапа Малюжыц. Яна адна сабрала 15 цэнтнераў курынага памёту. Таксама поўнасцю загатоўлена і мінеральнае ўгнаенне.

Насенне ў нашым калгасе высокасортнае. Яно ёсць у нас у дастатковай колькасці. Для ачысткі насення праўленне выдзяліла 6 лепшых стаханавак. Яны перачысцілі ўсё зярно два разы. Апошнюю ачыстку скончылі 25 лютага.

Калі ўзяць у аснову такія фактары, як ачыстка насення, рамонт сельскагаспадарчага інвентара, загатоўка і вывазка ўгнаенняў, то можна сказаць, што наш калгас поўнасцю падрыхтаваўся да веснавой сяўбы 1941 года. Нашу гатоўнасць пацвердзіла і камісія па праверцы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Трэба сказаць, што энтузіязм у рабоце ў гэтым годзе ва ўсіх ў нас выключна вялікі. Пастанова партыі і ўрада «Аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў за павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур і прадуктыўнасці жывёлагадоўлі па Беларускай ССР» натхніла калгаснікаў на больш упартую і пладатворную працу.

У гэтым годзе нашаму калгасу патрэбна пасеяць больш 230 гектараў яравых культур, 100 гектараў бульбы. Усю плошчу мы абавязаліся засеяць за 15 дзён, прымяняючы ўсе правілы агратэхнікі. Абавязацельства сваё спадзяемся выканаць. У нас у калгасе ёсць нямала людзей, якія выдатна працуюць, стараюцца, каб калгас стаў перадавым у раёне.

У гэтым годзе калгас „Першая конная", Новадворскага сельсовета, Мінскага раёна, пашырыў сваю парніковую гаспадарку на 100 рам. У бліжэйшыя дні калгас дасць кааперацыі свежы салат і радыску.
На здымку: Калгасніца паляводчай брыгады С. І. Мазалеўская за паліўкай салата.

Фото І. Рабіновіча.

К прыкладу можна ўзяць стаханаўку першай паляводчай брыгады Марыю Навіцкую. Яна на ўсіх палявых работах—на праполцы, копцы бульбы, жніве, цярабленні ільну—нормы выпрацоўкі выконвала на 200 з лішнім процантаў. Тав. Навіцкая звеннявая. За атрыманы высокі ўраджай яна была ўдзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

Ураджай зернавых культур, а таксама і бульбы ў нашым калгасе быў у мінулым годзе нядрэнны. Бульбы ў сярэднім мы атрымалі з аднаго гектара 225 цэнтнераў, жыта з гектара—12 цэнтнераў, ячменю—9,5 цэнтнера, аўса—9 цэнтнераў.

У 1941 годзе ставім перад сабой задачу атрымаць значна большы ўраджай па ўсіх культурах. Гэты год павінен быць азнамянован выдатнымі перамогамі ў справе павышэння ўраджайнасці соцыялістычнай сельскай гаспадаркі.

Марына Сцяпанаўна Манак—
старшыня калгаса «12-годдзе Кастрычніка»

Чырвона-Слабодскі раён.

НА БАЛОТНЫХ ПРАСТОРАХ

Адным з адвячоркаў, некалькі тыдняў назад, у калгас «Чырвоныя лукі» прыбылі свежыя газеты. У клубе іх хутка разабралі і тут-жа пачалі чытаць. У газетах была надрукавана пастанова партыі і ўрада аб плане асушэння і асваення асушаных зямель Беларусі.

Асаблівую радасць выклікала тое месца пастановы, дзе расказвалася пра поспех роднага калгаса. А там было надрукавана: «Калгас «Чырвоныя Лукі» Васілевіцкага раёна, Палескай вобласці, асушыў 240 гектараў балот і на асушаных землях атрымаў у 1940 годзе ўраджай зернавых культур 21 цэнтнер з гектара, бульбы 230 цэнтнераў з гектара, сена 79 цэнтнераў з гектара. За кошт асвоеных балот калгас павялічыў у 1940 г., у параўнанні з 1936 г., валавы збор сена з 1100 цэнтнераў да 5600 цэнтнераў».

— Сталін і Молатаў падпісалі! Бачыце, у Маскве пра нас Сталін ведае!—сказаў нехта з прысутных.

Гэта заўвага разрадзіла маўчанне і ўнутранае хваляванне. Загаварылі разам, перабіваючы адзін другога. Кожны хацеў выказаць свае пачуцці і радасць. Пачалі ўспамінаць як хто працаваў, як асушалася векавая багна, пачалі меркаваць і аб будучым.

Жанчыны і дзяўчаты прынялі актыўнейшы ўдзел у гэтай гутарцы. Ім было што расказаць, аб чым успомніць,—летась яны папрацавалі на-славу.

Ранняй вясной, калі замаразкі яшчэ не пакінулі зямлі, калі сонца толькі свяціла, а не грэла, на балотныя ўчасткі выходзілі калгаснікі з тапарамі. Церабілі алешнік, бярэзнік, хмызняк, карчавалі балота. Калі зямля адтала, наступіла чарга лапат і шуфляў. Па вешках, устаноўленых брыгадзірамі, капалі канавы, і магістралі далёка ішлі наперад, праразаючы масівы ўдоўж і ўпоперак.

З гэтых работ многае выканалі жанчыны, асабліва маладыя дзяўчаты. Лукер'я Казёл з падружкамі выходзіла зацемна на работу. У спрытных руках паблісквай тапор: Лукер'я церабіла. Затым яна карчавала, падчышчала будучае ўраджайнае поле. Ад яе не адставала бойкая комсамолка Харытына Заяц. У рабоце яна знаходзіла сваё прызванне, без работы яна не магла прабыць і дня. Цяжка дзяўчатам давалася карчоўка,—гэта, бадай, найцяжэйшая работа па асушцы. І калі вялікі пень не паддаваўся, адна клікала другую, разам падкопвалі, падсякалі карэнні і сілай дружным парывам вывалаквалі яго на верх. Работа ішла спорна.

Позняй восенню, калі абмалаціліўраджай, пачаўся разлік па працаднях. Дзяўчаты Харытына Заяц, Лукер'я Казёл атрымалі каля 900 кілограмаў толькі зернавых. Балотная глеба, асвоеная калгаснікамі, дала багаты ўраджай.

Калгаснікі рашылі ў гэтым годзе асушыць і асвоіць новых 150 гектараў зямлі. На заўтра, па атрыманні пастановы партыі і ўрада яны вышлі на расцяробку новых насцілаў. Кожны дзень выходзілі на мёрзлае балота, ачышчалі яго прастор, церабілі і карчавалі. І ў гэтыя дні, як і летась, дзяўчаты выдатна працавалі. Як і раней уперадзе шлі Надзя Заяц, Харытына Заяц, Лукер'я Казёл, Ніна Кірыленка, Антося Новік.

Вечарамі, звяртаючыся дамоў, запявала Надзя, прытоптвала па замарожанай глебе і задорна пытала:—Спяем, дзеванькі?—І першай пачынала запеўку.

А. Амелеў.

Васілевіцкі раён, Палескай вобласці.

Калгаснікі сельгасарцелі „Чырвоная Гусараўка" (Рагачоўскі раён, Гомельская вобласць) за работай па асушэнню балот. На першым плане комсамолка Маня Сямёнава.

Фота А. Шаевіча (БЕЛТА).

Справа вялікай важнасці

Партыйная арганізацыя раёна і непартыйныя большэвікі, ўзброіўшыся гістарычнымі рашэннямі XVIII з'езда партыі, у мінулым годзе правялі вялікую работу па мабілізацыі калгасных мас на асваенне балот і ператварэнне іх у пладародныя палі і сенажаці. У гэту вялікую работу ўключылася 37 калгасаў раёна, машына-трактарныя станцыі. У рэзультаце за 20 дзён было асушана 1530 гектараў балот, з якіх у тую-ж вясну ўзаралі 700 гектараў.

Дружна і арганізавана выходзілі на меліяратыўныя работы жанчыны-калгасніцы. Яны ішлі на самыя цяжкія працэсы работы і ні ў чым не ўступалі мужчынам. Было разгорнута соцыялістычнае спаборніцтва. Брыгада спаборнічала з брыгадай, звяно са звяном, калгаснік з калгаснікам. Дзякуючы гэтаму многія значна перавыконвалі нормы.

Перадавыя калгасніцы сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны ўсход», Халмянскага сельсовета, Ольга Старавойтава, Варвара Коласава, Софья Еўстратоўская пры норме 11 кубаметраў за дзень выкідалі па 32 кубаметры тарфяной масы. Гэта ініцыятары меліяратыўных работ. Па іх раўняліся жанчыны іншых калгасаў.

К прыкладу Ульяна Гвоздзь, Матруна Грэбенчук з калгаса «Ленінскі шлях», Асташкавіцкага сельсовета, штодзённа выходзілі на работу па асушцы балот. Норма іх выпрацоўкі з кожным днём павялічвалася і дасягнула да 200—250 процантаў выканання.

Выдатная праца стаханаўцаў меліяратыўных работ ацэнена. 40 меліяратараў Даманавіцкага раёна атрымалі грашовую прэмію ад Наркамата Земляробства і абласнога аддзела земляробства.

Ужо ў мінулым годзе на асушаных балотах былі засеяны вялікія масівы азімымі культурамі. Старанная праца калгаснікаў аплацілася высокім ураджаем. Калгас «Чырвоны усход», Халмянскага сельсовета, засеяў 23 гектары асушаных зямель аўсом і просам. Ураджай атрымалі выдатны: з кожнага гектара аўса знялі 27 цэнтнераў, проса—18. Калгас «Новыя халоднікі», Даманавіцкага сельсовета, на асушаным балоце зняў з гектара ўраджай аўса 21 цэнтнер і проса 12 цэнтнераў.

Больш за ўсіх асвоіў асушаных балот калгас «Чырвоная звязда». У мінулым годзе было ўжо засеяна 85 гектараў рознымі культурамі, аўсом, просам, канопляй, рознымі травамі.

Натхнёныя гістарычнай пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб асушэнні балот у Беларускай ССР і скарыстанні асушаных зямель калгасамі для расшырэння пасеўных плошчаў і сенажацяў» калгаснікі раёна сапраўды па-стаханаўску прыступілі к меліяратыўным работам. Калгаснікі расчышчаюць масівы, дзе потым будуць капаць канавы, асушваць балоты.

Па раёну кожны дзень на расчыстку балотных масіваў выходзіць звыш 1000 чалавек. І тут у меліяратыўных работах жанчыны з'яўляюцца вялікай сілай. Калгасніцы Марфа Тарасюк, Алеся Гарбачэнка з калгаса «Пабеда Советаў», Халмянскага сельсовета, штодзённа выходзяць на расчыстку балота і выконваюць норму на 200 процантаў.

Да 1945 года ў раёне павінна быць асушана больш 19 000 гектараў балот. Да гэтай вялікай і пачотнай работы партыйныя і непартыйныя большэвікі раёна дзейсна рыхтуюцца. Загатоўлена больш 1 200 балотных лапат і шуфляў. Завезена 1300 тон калійных і фосфарных угнаенняў. Падрыхтавана на курсах 35 брыгадзіраў па меліярацыі. Арганізавана 13 меліяратыўных участкаў. Падабраны палітработнікі, а таксама рэдактары насценных газет на ўчастках. Праведзена некалькі нарад па меліярацыі.

У сувязі з праводзімай меліярацыяй багацейшыя перспектывы мае наш раён. У 1945 годзе мы будзем мець больш 19 000 гектараў асвоеных высокаўраджайных тарфянікаў. Усё гэта ў корані зменіць эканоміку раёна, ператворыць яго ў квітнеючы, багаты ўсімі відамі сельскагаспадарчых прадуктаў раён.

М. Е. Еўтушэнка.

Даманавіцкі раён

На Малеўскім сырзаводзе (Несвіжскі раён, Баранавіцкая вобласць). Памочнік майстра, стаханаўка Е. І. Доўнер за праглядам гатовай прадукцыі.
Фота К. Якубовіча (БЕЛТА).

Палеская кантрольна-насенная лабараторыя (г. Мозыр) аказвае велізарную дапамогу калгасам вобласці ў атрыманні высокіх сталінскіх ураджаяў.
На здымку: Аграном Т. З. Антаневіч правярае якасць насення ільна.
Фота І. Аўруцкага (БЕЛТА).

На здымку: Гімнастычныя практыкаванні курсантаў рэспубліканскай школы піонерважатых. (Мінск).
Фото Дынкіна

Звяно Анастасіі Лізунок

У 1937 годзе ў калгасе «Шлях Ільіча» на асушаным балоце ўпершыню была пасеяна новая культура—кок-сагыз. Калгаснікі прыходзілі на тарфянішча і разглядалі новую расліну. Знатакі гаварылі, што гэта вельмі каштоўная культура, з якой робяць гуму.

Для работы на плантацыях кок-сагыза выдзелілі лепшых людзей, якія маглі дабіцца высокага ўраджаю. У 1938 годзе праўленне калгаса і пярвічная комсамольская арганізацыя вылучылі комсамолку Анастасію Лізунок звеннявой па кок-сагызу ў маладзёжнае звяно.

Таварыш Лізунок да гэтага працавала ў палявой брыгадзе. Яна паказвала прыклад у рабоце многім калгасніцам. На жніве, на праполцы, копцы бульбы і іншых сельскагаспадарчых работах нормы выконвала на 150—200 процантаў.

Першы год работы на плантацыі кок-сагыза быў вопытам для маладзёжнага звяна. Увосень Анастасія дастала адпаведную літаратуру па каучукаводству і разам з дзяўчатамі пачала вывучаць яе. Яны многа чыталі аб кок-сагызе і гэта дапамагло павысіць ураджай у наступныя годы.

Сеяла кок-сагыз звяно тав. Лізунок ранняй вясной на глыбіні 1,5 сантыметра. Сеялі ўручную пад маркер і прысыпалі торфам. Праз 20—25 дзён з'яўляліся ўсходы. Калі кок-сагыз выпускаў пяць-сем лісткоў, рабілі падкормку мінеральнымі ўгнаеннямі (паўтара цэнтнеры калійнай солі, два з паловай цэнтнеры суперфасфата на гектар). Клалася ўсё ў сухім выглядзе. На працягу лета 6 раз правялі праполку, тры разы рыхлілі глебу паміж радкамі.

За атрыманне высокага ўраджаю па кок-сагызу Анастасія Лізунок была ўдзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 года. Галоўны выставачны камітэт узнагародзіў яе вялікай сярэбранай медаллю. Па загаду Народнага Камісарыята Земляробства яна атрымала другую прэмію ў суме 750 рублёў.

Не меншых поспехаў дабілася Анастасія і ў 1940 годзе. Звяно зняла з кожнага гектара двухгадовай плантацыі насеннага ўчастка ўраджай па 94 кілограмы насення і па 25 цэнтнераў карэння кок-сагыза. Тав. Лізунок з'яўляецца кандыдатам на выстаўку 1941 года.

У мінулым годзе акрамя насеннаводчых плантацый у калгасе «Шлях Ільіча» было пасеяна 23 гектары кок-сагызу. Многа прышлося папрацаваць калгаснікам на плантацыях. Але затое ўраджай атрымалі выдатны. З усёй плошчы знялі па 31 цэнтнеру карэння з кожнага гектара.

Згодна пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па расшырэнню пасеваў і павышэнню ўраджайнасці кок-сагыза» для калгасаў Беларускай рэспублікі ўстаноўлена норма ўраджайнасці 13,5 цэнтнера на гектар. Сельскагаспадарчая арцель «Шлях Ільіча» гэту норму на многа перавыканала. Калгас здаў дзяржаве звыш плана 713 цэнтнераў карэння кок-сагыза.

Распрацоўваючы гэту пастанову партыі і ўрада звяно Анастасіі Трафімаўны Лізунок абавязалася дабіцца яшчэ больш высокіх ураджаяў кок-сагызу. Да веснавой сяўбы маладзёжнае звяно падрыхтавалася добра. Яно поўнасцю гатова к выхаду ў поле.

В. Шпакоўскі.

Стара-дарожскі раён.

Скарыстаем народныя зберажэнні на ўмацаванне магутнасці нашай краіны

Вялікай папулярнасцю карыстаюцца дзяржаўныя пазыкі ў совецкага народа. Трымальнікі аблігацый ганарацца тым, што частка іх уласных сродкаў укладзена ў сотні новых фабрык, заводаў, тысячы кілометраў чыгунак, у новапабудаваныя школы, яслі, клубы і іншыя культурныя ўстановы.

За годы двух Сталінскіх пяцігодак паступленні па пазыках склалі каля 25 мільярдаў рублёў. Вялікія даходы ад пазык атрымліваюць і самі працоўныя ў выглядзе выйгрышаў. За адзін толькі 1940 год па Беларускай рэспубліцы выплачана насельніцтву звыш 20 мільёнаў рублёў выйгрышаў па дзяржаўных пазыках.

Рост заможнасці працоўных СССР стварыў добрыя ўмовы для далейшага павелічэння народных зберажэнняў. Значная частка гэтых зберажэнняў знаходзіцца на хаванні ў дзяржаўных ашчадных касах. За апошнія годы агульная сума зберажэнняў, якія захоўваюцца ў ашчадных касах, павялічылася ў 20 з лішнім разоў. Зараз агульны астатак укладаў ва ўсіх ашчадных касах Совецкага Саюза перавышае 7 мільярдаў рублёў. У Беларусі гэта сума дасягае да 174 мільёнаў рублёў. Усіх укладчыкаў у нашай рэспубліцы налічваецца больш 420 тысяч.

Захоўваючы свае зберажэнні ў ашчадных касах, працоўныя прыносяць вялікую карысць дзяржаве і самі атрымліваюць

Тав. Карніцкая. Кантралёр Самахвалавіцкай ашчаднай касы.

многа выгад. Ашчадныя касы Беларускай рэспублікі за адзін толькі мінулы год выплацілі ўкладчыкам больш 4 мільёнаў 350 тысяч рублёў процантаў.

У мэтах больш шырокага і лепшага абслугоўвання працоўных з кожным годам пашыраецца сетка ашчадных кас. У 1940 годзе па БССР было адкрыта новых 451 ашчадная каса. З іх на сяле—240. У гэтым годзе будзе дадаткова адкрыта 225 ашчадных кас і ў большай частцы на сяле.

У ашчадных касах працуюць сотні выдатных людзей. І сярод іх не мала жанчын, якія паказваюць узоры работы па ўмеламу і культурнаму абслугоўванню насельніцтва. Да ліку такіх перадавікоў можна аднесці кантралёра Самахвалавіцкай ашчаднай касы, Мінскага раёна, тав. Карніцкую. За кароткі час яна больш чым падвоіла астатак укладаў. Тав. Карніцкая праводзіць вялікую масава-растлумачальную работу сярод насельніцтва.

Кантралёр Ратамскай ашчаднай касы, Мінскага раёна, тав. Сінякевіч, з'яўляючыся старшынёй бюджэтнай камісіі сельскага Совета дэпутатаў працоўных, арганізавала актыў з перадавых людзей калгаснай вёскі. Пры дапамозе актыва дабілася астатка ўкладаў у ашчадную касу звыш 100 тысяч рублёў.

Пачотнае званне стотысячнікаў заваявалі кантралёр ашчаднай касы, Парыцкага раёна, тав. Камісарава, кантралёр Старасельскай ашчаднай касы, Шклоўскага раёна, тав. Казакова, кантралёр Ліпеньскай ашчадкасы, Асіпавіцкага раёна, тав. Халімонава і інш. Усе яны з квартала ў квартал перавыконваюць план мабілізацыі сродкаў насельніцтва, культурна і ўмела абслугоўваюць працоўных.

Але гэта толькі пачатак той велізарнейшай работы, якая ўскладзена на працаўнікоў ашчадных кас у сувязі з рашэннямі VIII Сесіі Вярхоўнага Совета Саюза ССР.

Жанчыны-патрыёткі нашай радзімы павінны ўсямерна аказваць дапамогу работнікам ашчадных кас па мабілізацыі сродкаў насельніцтва на фінансіраванне сацыялістычнага будаўніцтва і ўмацаванне абароназдольнасці нашай краіны.

Ю. Б. Шымшэлевіч, старшы эканаміст Упраўлення Дзяржпрацашчадкас і Дзяржкрэдыта БССР.



На Рагачоўскай картоннай фабрыцы імені Сталіна (Гомельская абласць). Заработай стаханаўка, комуністка Е. Н. Варочкіна, якая выконвае на двух дэфіброрах норму на 110 процантаў. Фота А. Шаевіча (БЕЛТА).

На цагельным заводзе

Здалёку відаць высокая дымячая труба і заводскія збудаванні. Ад кар'ера адна за другой выкатваюцца ваганеткі. Па рэйках вузкакалейкі бягуць яны, падцягваемыя металічным тросам угору, нагружаныя глінай. Спрытныя рукі работніц лоўка апракідваюць ваганетку, вызваляюць яе ад гліны, і ваганетка хутка імчыцца ўніз—назад у кар'ер.

Мінскі цагельны завод № 1, вырабляе вельмі каштоўны і неабходны матэрыял для будаўнічай прамысловасці. Завод працуе бесперапынна зімой і летам. У 1941 годзе ўпершыню ў Беларусі на гэтым заводзе прымянялі экскаватар для здабычы гліны ў зімовых умовах. Экскаватар працуе пры любым надвор'і, нават у самыя вялікія марозы. Раней гэту працаёмкую работу выконвалі ручным спосабам, на што затрачвалася многа рабочай сілы.

Цагельны завод № 1 з'яўляецца перадавым у Беларусі. За ўзорную работу калектыў завода атрымаў пераходны чырвоны сцяг Наркамата прамысловасці будматэрыялаў БССР і ЦК Саюза.

Узятае на сябе абавязацельства дастойна сустрэць адкрыццё XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі завод з чэсцю выканаў. План першага квартала закончыў 10 сакавіка. Да канца першага квартала завод выпусціў звыш плана яшчэ 1 628 тысяч штук цэглы.

Рабочыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі завода звярнуліся да ўсіх рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых прамысловасці будматэрыялаў Беларусі з адозвай, у якой пішуць: «Растучая патрэба рэспублікі ў мясцовых будаўнічых матэрыялах патрабуе ад нас, работнікаў прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, рашучага палепшання работ нашых прадпрыемстваў».

Калектыў завода ўнёс прапанову «абвясціць у 1941 годзе ўсебеларускае соцыялістычнае спаборніцтва на датэрміновае выкананне дзяржаўнага плана па колькасці і якасці прадукцыі, на лепшы завод, на лепшую апальваючую печ і лепшы прэс».

Лепшыя стаханаўкі цагельнага завода № 1 (злева направа)— тт. Буранкова і Н. Б. Дарашэвіч каля прэсмашыны.
Фото Б. Дынкіна.

За паспяховае выкананне гэтай задачы ўзяліся рабочыя завода. Разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва цэхаў, брыгад і асобных рабочых. Уведзен сутачны графік работы, установлен строгі тэхналагічны рэжым. Абвешчана рашучая барацьба за навядзенне парадка і чыстаты на вытворчасці. Усе гэтыя мерапрыемствы накіраваны на выкананне гістарычных рашэнняў XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

Віднае месца ў барацьбе за выкананне ўзятых абавязацельстваў займаюць жанчыны. Жанчыну тут можна бачыць на любым участку работы: на адрэзцы, адвозцы цэглы, на абпальванні, на пагрузцы і выгрузцы цэглы з гофманскіх пячэй.

Калектыў завода ганарыцца работніцамі: абпальшчыцай Сцефанідай Арловай, загрузчыцай цэглы ў гофманскую печ Шкрэдавай, адвозчыцай сырца ад прэса Краснашчокавай. Перадавікамі вытворчасці з'яўляюцца адрэзчыца цэглы Баганёва, істапніца штучнай сушылкі Картанёва, адрэзчыца Бурэнкова, кругаўшчыца Агеева. Усе яны перавыконваюць нормы, усе яны стаханаўкі.

На выгрузцы цэглы з гофманскай печы раней працавалі выключна мужчыны. Яшчэ ў 1936 годзе Сцефаніда Арлова даказала, што і жанчына можа працаваць на гэтай рабоце. Праз некаторы час яе, як лепшую стаханаўку, паслалі на курсы абпальшчыкаў. Вось ужо другі год яна працуе на абпалцы цэглы. Печ Арловай—адна з лепшых на заводзе.

Адрэзчыца цэглы Феня Філіпенка працуе на заводзе ўжо каля 4 год. Як чэсную і добрасумленную работніцу, рабочыя абралі яе профгрупоргам змены. Філіпенка цікавіцца не толькі работай на вытворчасці, але і бытавымі ўмовамі рабочых. За стаханаўскую работу яна многа разоў прэміравана.

Кругаўшчыца Агеева працуе на двух працэсах. Яна кругаўшчык і сцэпшчык. На абодвух працэсах норму выконвае на 120—130 процантаў.

Завод працуе роўнамерна без штурмаўшчыны. Барацьба кожнай брыгады, змены за выкананне графіка забяспечвае высокую планамерную выпрацоўку.

Змагаючыся за паспяховае выкананне і перавыкананне вытворчага плана бягучага года, калектыў завода гэтым самым змагаецца за пяршынства ў соцыялістычным спаборніцтве.

А. Фёдарава.

Мінск.

Здарэ
з Яўсей

Аднойчы маленькі хлопчык Яўсейка—вельмі добры чалавек!—седзячы на беразе мора, вудзіў рыбу. Гэта вельмі невясёлая справа, калі рыба капрызнічае, не клюе.

А дзень быў гарачы, пачаў Яўсейка, ад нуды, драмаць і бултых!—звалiўся ў ваду.

Звалiўся, але, нічога, не спалохаўся і плыве ціхенька, а потым даў ныpца і зараз-жа апынуўся на дне мора.

Сеў на камень, мякка пакрыты рыжымі водараслямі, глядзіць вакол — вельмі добра!

Паўзе, не спяшаючыся, чырвоная марская звязда, важна ходзяць па каменнях вусатыя лангусты, бокам-бокам паўзе краб; усюды, на каменнях, нібы буйныя вішні, рассыпаны актыніі, і ўсюды безліч усялякіх цікавых рэчаў: вось цвітуць, калышуцца марскія лілііі, мільгаюць, нібы мухі, быстрыя краветкі, вось цягнецца марская чарапаха, а над яе цяжкім панцырам гуляюць дзве маленькія зялёныя рыбкі, зусім як матылькі ў паветры, а вось, па белых каменнях, вязе сваю ракавіну рак-адшэльнік. Яўсейка, гледзячы на яго, нават верш успомніў:

Дом,—не павозка ў дзядзькі ў Якава...

І раптам чуе, над галавою ў яго нібы кларнет запішчэў:

— Вы хто такі?

Глядзіць, над галавою ў яго велізарнейшая рыба, з шызасрэбнай лускою, вытарашчыла вочы і, выскаліўшы зубы, прыемна ўсміхаецца, нібы яе ўжо сасмажылі і яна ляжыць на талерцы сярод стала.

— Гэта вы гаворыце?—запытаў Яўсейка.

— Я-а...

Здзівіўся Яўсейка і сярдзіта пытаецца:

— Як-жа гэта вы? Рыбы-ж не гавораць!

А сам думае:

«Вось дык раз! Нямецкай мовы я зусім не разумею, а рыбіну мову адразу зразумеў!»

Вялікая-ж рыба прыстае да яго:

— Адкуль гэта вы ўзялі, што ўсе рыбы—нямыя?

— Тата сказаў.

— Што такое—тата?

— Так сабе... Падобны да мяне, толькі—большы і вусы ў яго.

— А ён рыбу есць?

Тут Яўсейка спалохаўся: скажы вось ёй, што есць!

Узняў вочы ўверх, бачыць, скрозь ваду, мутна-зялёнае неба і сонца ў ім, жоўтае, як медны паднос; падумаў хлопчык і сказаў няпраўду:

— Не, ён не есць рыбу, касцістая вельмі...

— Аднак, — якое невуцтва!—пакрыўджана ўсклікнула рыба.—Не ўсе-ж мы касцістыя! Напрыклад,—маё сямейства...

«Трэба перамяніць гутарку», здагадаўся Яўсей і далікатна пытаецца:

— Вы былі ў нас на версе?

— Вельмі мне патрэбна!—сярдзіта фыркнула рыба.—Там дыхаць няма чым...

— Затое—мухі якія...

Рыба праплыла вакол яго, спынілася проста супроць носа, ды раптам і кажа:

— Мух-хі? А вы чаго сюды прыплылі?

«Ну, пачынаецца!—падумаў Яўсейка. — З'есць яна мяне, дурніца!»

І, нібы бесклапотна, адказаў:

— Так сабе, гуляю...

— Гм? — зноў фыркнула рыба.—А можа, вы—ужо тапелец?

— Вось яшчэ! — пакрыўджана крыкнуў хлопчык.—Ніколькі нават! Я, вось, зараз устану і...

Папрабаваў устаць, а—не можа: нібы яго цяжкой коўдрай ахуталі,—ні павярнуцца,

М. ГОРКІ

...РЭННЕ ...ейкам

...проць ...:
...сюды
...—паду-
...яна
...а, ад-
...
...окнула
...ко та-
...крыў-
...ык.—
..., за-
...а—не
...й коў-
...нуцца,

ні крануцца!

«Зараз я пачну плакаць», падумаў ён, але ў той-жа час зразумеў, што плач не плач— у вадзе слёз не відаць, і парашыў, што не варта плакаць, — можа, як-небудзь інакш удасца выкруціцца з гэтай непрыемнай гісторыі.

А навокал—бацюхны!—сабралася розных марскіх жыхароў—ліку няма! На нагу ўзлазіць галатурыя, падобная на дрэнна намаляванае парася. Дрыжыць перад носам марскі пузыр, надуваецца, пыхкае,—дакарае Яўсейку:

— Прыгож-прыгож! Ні рак, ні рыба, ні малюск, ай-яй-яй!

Праплыла міма сепія, зусім, як мокрая насавая хустачка.

А навокал у вадзе павіслі рыбы — мноства! —вытарашчылі на хлопчыка круглыя вочы, бармочуць:

— Не падобны ён ні да рака, ні да нас—шмат у чым! Ці не радня ён агідным васьміногам?

«Дурніцы!» —пакрыўджана думае Яўсейка і робіць такі выгляд, нібы ён нічога не чуе, нават хацеў бесклапотна пасвістаць, але — аказалася — нельга: вада лезе ў рот, нібы корак.

А гаваркая рыба ўсё пытаецца ў яго:

— Падабаецца вам у нас?

— Не... хаця—так, падабаецца... у мяне дома... таксама вельмі добра!—адказаў Яўсейка і зноў спалохаўся:

«Бацюхны, што я кажу?! Раптам яна ўзлуецца, і пачнуць яны мяне есці...»

Але ўголас кажа:

— Давайце як-небудзь гуляць, а то мне крыху нудна...

Гэта вельмі спадабалася гаваркой рыбе, яна засмяялася, разявіўшы круглы рот так, што сталі відаць ружовыя жабры, віляе хвастом, блішчыць вострымі зубамі і старэчым голасам крычыць:

— Гэта добра — пагуляць! Гэта вельмі добра—пагуляць!

— Плывем наверх!—прапанаваў Яўсей.

— Ну што-ж! Плывем!— сказала рыба, перавярнуўшыся галавою ўверх, а Яўсей зараз-жа цап яе за жабры і крычыць:

— Я гатоў!

А сам думае:

«Вось толькі-б яна мяне крышку падцягнула наверх, а там ужо я вынырну».

Паплыла рыба, нібы танцуючы. Чым вышэй, тым хутчэй і лягчэй, і раптам Яўсейка адчуў, што галава яго выскачыла наверх.

— Ой!

Глядзіць, — ясны дзень, сонца іграе на вадзе, зялёная вада плёскае на бераг, шуміць, спявае. Яўсейкава вудзільна плавае ў моры, далёка ад берага, а сам ён сядзіць на тым-жа камені, з якога зваліўся, і ўжо—увесь сухі!

— Ух,—сказаў ён, усміхаючыся сонцу,—вось я і вынырнуў!

Змітрок Бядуля

МАЛАДАЯ ВЯСНА

То не снег,
То чаромха цвіце.
То не снег,
То бярозка расце.
То не снег—
Расцвітае садок.
То не снег,
А ляціць матылёк.
То не шоўк,
Гэта рунь ля гары.
То не шоўк,
А сон—цвет у бары.
То не шоўк,
А мурожны лужок.
То не шоўк—
Маладзенькі лянок.

Не гусляр,
То пяюць салаўі.
Не гусляр,
То звіняць ручаі.
Не гусляр,—
Дрозд у гаі пяе.
Не гусляр,
Гэта пчолка гудзе.
Ах, вясна
Маладая мая!
Пад табой
Ажывае зямля.
Пад табой
І звініць і пяе
Нават жук,
Нават мушка ў траве.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна

Паходжанне і класавая сутнасць вялікадня

Велізарнейшымі перамогамі соцыялізма ў нашай краіне з'яўляецца масавы адыход працоўных ад рэлігіі, масавы рост ваяўнічага бязбожжа. Мільёны працоўных Совецкага Саюза парвалі ўжо з рэлігіяй, з рэлігійнымі забабонамі, бо яны зразумелі рэакцыйную сутнасць рэлігійнага вучэння. Аднак, яшчэ маюцца ў нашай краіне адсталыя слаі працоўных, якія да гэтага часу не вызваліліся ад рэлігійных забабон. Тлумачыцца гэта тым, што рэлігійная ідэалогія—адна з упартых ідэалогій, якой вякамі эксплаататары адурманьвалі працоўных. Таму патрэбна настойлівая сістэматычная растлумачальная работа, паказваючая паходжанне, рэакцыйную сутнасць і соцыяльную шкоднасць рэлігіі.

Адным з галоўных свят веруючыя лічаць вялікдзень. Яшчэ задоўга да гэтага свята служыцелі рэлігійных культаў—папы, ксяндзы, рабіны і сектанцкія прапаведнікі пачынаюць узмоцненую апрацоўку веруючых для адурманьвання іх свядомасці. У іх баснях аб паходжанні вялікадня няма ні слова праўды.

Ва ўсіх старажытных народаў яшчэ з часоў дзікунства і варварства існавалі вясеннія святы, прысвечаныя духам і бажаствам пладароднасці, сонца і расліннасці. У часе гэтых свят прыносіліся ў афяру духам расліны, жывёла і нават людзі.

Свята вялікдзень быў у старажытных яўрэяў, калі яны яшчэ былі вандроўнікамі-жывёлаводамі. У гэта вясновае свята яны імкнуліся ўміласцівіць уяўляемых злосных духаў пустыні. Штогодна вясной з першага прыплода адбіралі і прыносілі ў афяру ягня ці агнеца. Гэта афяра называлася «вялікаднем». Калі яўрэі пасяліліся ў Палесціне, яны заняліся земляробствам і стварылі сваю дзяржаву, у іх устанавіўся абрад прынясення ў афяру пладоў новага ўраджаю. З мукі першага снапа выпякалася абрадавае пячэнне маца, імем якім называлася свята. Нарэшце свята мацот злілося з вясновым вялікаднем і прыняла яе назву. Гэта назва вялікдзень разам з уяўленнем аб збавіцельнай афяры—агнцы ад старажытных яўрэяў перанялі хрысціяне.

Тлумачэнне аб тым, што яўрэйскі вялікдзень установлен у памяць вызвалення старажытных яўрэяў ад егіпецкага палона з'яўляецца вымыслам. Яўрэі ў палоне не былі і ніхто іх адтуль не вызваляў. Гэта казка была выдумана равінамі і носіць нацыяналістычны характар. Яшчэ пазней калі яўрэйская дзяржава была разбурана, а самі яўрэі аказаліся пад уладай чужаземцаў, з вялікаднем пачалі звязваць вераванне ў быццам прадстаячы выход «месіі—хрыста спасіцеля», які прывядзе яўрэяў зноў у Палестыну і падпарадкуе яўрэям усе народы свету. Гэта шавіністычная дзікая думка праводзіцца ў вялікадзённых малітвах яўрэяў.

Хрысціянскія прапаведнікі тлумачаць паходжанне вялікадня казкай аб тым, што сын бога Хрыстос зышоў з неба на зямлю, памучыўся на зямлі за грахі людзей, быў распят на крыжы, памёр, а потым уваскрос і пасля 40 дзён узнёсся на неба. Навука ўстанавіла, што ўсе расказы аб Хрысце з'яўляюцца выдумкай, што Хрыстос ніколі не памірaў і не існаваў.

Яшчэ задоўга да хрысціянства ў многіх старажытных народаў была вера ў багоў сонца, пладароддзя, расліннасці. Веруючыя земляробы і жывёлаводы Егіпта, Вавілона, Асірыі і іншых краін верылі, што іх багі штогод паміраюць увосень і ажываюць увесну. І што быццам-бы ад гэтага залежыць нараджэнне сіл прыроды і шчасце людзей. Гэтыя багі-збавіцелі прадстаўляліся ў выглядзе юнака, які памірае і ажывае. Уяўленні працоўных, падаўленыя незразумелымі для іх сіламі прыроды, эксплаатацыяй, нішчатой і класавым прыгнётам пачалі бачыць у гэтых багах-спасіцелях «добрачынцаў» чалавецтва. У казцы аб егіпецкім богу гаварылася, што злы бог Сет умярцвіў Озарыса, які потым хутка стаў царом замагільнага свету. Вельмі падобнымі на егіпецкага бога Озарыса былі і іншыя ўсходнія багі, вавілонскі Тамуз, сірыйскі Адоніс і іншыя. Штодзённа вясной утваралася свята ў чэсць уваскрасання гэтых багоў. Гэтыя святы спраўляліся так, як потым хрысціяне спраўлялі свята вялікадня. Багаслужэнне насіла сумны характар, рабілі аплакванне бога перад вобразам яго ў труне. Вобраз бога абносіўся навокал храма пры выкананні сумных малітваў, потым жрацы апраналіся ў светлую вопратку і апавяшчалі веруючым, што «гасподзь уваскрос». Пасля гэтага храм заліваўся святлом, веруючыя віталі адзін аднаго. Свята прадаўжалася некалькі дзён і прымала разгульны характар. Усё гэта вельмі падобна на рэлігійныя абрады хрысціян у дні вялікадня і ўсё гэта гаворыць аб тым, што хрысціянская казка аб Хрысце з'яўляецца рэлігійнай фантазіяй.

Узнікла гэта казка ў рымскай рабаўласніцкай імперыі каля двух тысяч год таму назад. Рымская імперыя прадстаўляла тады магутную рабаўласніцкую дзяржаву. Уся гаспадарка гэтай дзяржавы трымалася на працы рабоў.

Гнёт і эксплаатацыя не раз выклікалі паўстанні рабоў, але гэтыя паўстанні жорстка падаўляліся. Асабліва выдатным было паўстанне пад кіраўніцтвам геаічнага правадыра рабоў Спартака за 73 годы да з'яўлення хрысціянства.

Пасля разгрома паўстання Спартака па дарозе, якая вяла ад цэнтра паўстання—Кандзі да Рыма была павешана 6000 рабоў. Ад паражэння ў барацьбе народныя масы Рымскай імперыі ўпадалі ў адчай, замяшанне.

І вось, у рэзультаце многіх паражэнняў у выніку бяссілля ў барацьбе з эксплаататарамі каля двух тысяч год назад сярод прыгнечаных, даведзеных да адчаю народных мас Рымскай імперыі нарадзілася казка аб сыне божым Ісусе Хрысце. У евангельскіх апавяданнях аб Хрысце многа супярэчнасцей і недарэчнасцей. Ніякіх успамінаў аб Хрысце няма і ў гістарычнай літаратуры. Ні адзін гісторык першага века не ўспамінае аб

Хрысце. У першым веку і ў пачатку II века ў Рыме і Грэцыі было многа пісьменнікаў і гісторыкаў, напрыклад Плутарх і Таціт, філосаф Сенека. Жыў у гэты час і яўрэйскі гісторык Іосіф Флавій, але ні адзін з іх нічога не павядамляе аб жыцці Хрыста.

Асновапаложнік марксізма Фрыдрых Энгельс даў нам нераўзыйдзены труд аб раннім хрысціянстве. Энгельс даказаў, што Хрыста, як гістарычнай асобы не было, што казка аб Хрысце складзена абаронцамі хрысціянства, што вобраз Хрыста рэлігійная фантазія.

Разам з хрысціянствам святкаванне вялікадня было перанесена ў X вяку і ў Расію. Нашы продкі славяне, як і ўсе старажытныя народы спраўлялі вясной свята, у часе якога яны імкнуліся задобрыць духаў прыроды, забяспечыць добры ўраджай і прыплод жывёлы.

Свята вялікдзень у вялікай пашане ў краінах капітала. Вялікодныя лозунгі «брацтва ў Хрысце», вялікодныя заклікі к прымірэнню з класавым прыгнечаннем—усё гэта з'яўляецца абманам, які прыкрывае нязноснае капіталістычнае рабства.

У сучасны момант свет ахоплен пажарам імперыялістычнай вайны. Палова насельніцтва зямнога шара ўцягнута ў вайну, якую зацеялі імперыялісты разам з духавенствам.

Папа Рымскі, які называў сябе намеснікам Хрыста на зямлі, выступіў не супроць другой імперыялістычнай вайны, а з заклікам благаслаўлення божага на галавы палітычных дзеячоў, арганізаваўшых вайну. Папа заклікае толькі да малітвы. Глава англійскай царквы архіепіскоп кентэрберыйскі лічыць вайну, пачатую імперыялістамі, справядлівай і якая як быццам вядзецца за справядлівасць і мір. Не адстаюць ад сваіх хрысціянскіх таварышоў і іўдзейскія рабіны і магаметанскія мулы.

Вялікодная пропаведзь служыць маскіроўкай для ворагаў нашай краіны, для антысовецкіх мэт. Усё гэта патрабуе ад нас умацавання антырэлігійнай прапаганды сярод працоўных. Самое свята вялікдзень, з яго традыцыйнай п'янкай і хуліганствам, з'яўляецца шкодным перажыткам, садзейнічае прагулам і нарушэнню працоўнай дысцыпліны.

Ф. Л. Долгаполаў.

Плакат мастака Г. Шубінай.

ПОП МАНІЎ К САБЕ Ў ЦАРКВУ, УСІМ ДУРМАНІЎ ГАЛАВУ...

Стаўце вушкі на макушкі,
Зрэжам пасху на карню.
Вось праўдзівыя частушкі
Пра папоўскую хлусню.

А ў старыя часы
Перад святам хадзіў поп,
Ён збіраў з людзей падатак,
Зацямняў увесь народ.

Поп маніў к сабе ў царкву
Усім дурманіў галаву,
Каб няслі яму за гэта
Мяса, сала і муку.

Поп на пасху казаў людзям—
«Кайцесь, кайцесь ад граха».
З аднаго бярэ яечка,
А з другога—петуха.

Раней цёмныя сяляне
Нідзе не вучыліся,—
Была «школай» ім царква,
Там яны маліліся.

А калісьці ў нашых вёсках
Ой, стаяла шмат царквей.
Поп чытаў у іх малітвы.
Зацямняў розум людзей.

Гаварыў раней нам поп:
«У гэтым жыцці мучымся,
А як ляжам мы ў гроб,—
У раі ўсе ачуцімся».

«У нас поп такі набожны»,
Гаварыў царкоўнік кожны,—
«Ён характар добры мае,
У рай паслаць усіх абяцае».

Раней мы ў царкву хадзілі,
Слухаць пропаведзь папа,
А папы нам гаварылі:
«Баба—мужава раба».

На сцяне ў адной бабулі
Лампадачкі віселі.
Дом згарэў, а хто быў вінен,—
Людзі зразумелі.

Пад гарой пустуе цэркаў,
Клуб з народам на гары.
Эх не дарам, эх, не дарам
Пелі пулі ў Окцябры.

(Частушкі запісаны ў розных раёнах БССР)

Нам пішуць

ЖАНЧЫНЫ ЦАМЕНТНАГА ЗАВОДА

Раней на цаментным заводзе «Рось» працавала 28 жанчын. Большасць з іх былі прыбіральшчыцамі, астатнія працавалі на падвозцы вугалю к цаментным пячам.

Зараз на заводзе працуе 148 жанчын, з іх 117—непасрэдна на вытворчасці. Яны авалодваюць мужчынскімі прафесіямі. Многія з'яўляюцца стаханаўкамі.

Вось былая батрачка польскіх памешчыкаў Ніна Віктараўна Смаршко. З першых дзён совецкай улады яна паказала ўзоры стаханаўскай работы на вытворчасці. Як лепшую работніцу завода яе абралі дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. Да Ніны Смаршко часта заходзяць выбаршчыкі за дапамогай і парадамі. Яна заўсёды стараецца ім дапамагчы, даць адказ на любое пытанне. На заводзе Ніна зараз кіруе тэхнічнай вучобай.

Вялікім аўтарытэтам сярод рабочых карыстаецца работніца кар'ера—комсамолка Вера Вераціла. Яна дэпутат раённага Совета дэпутатаў працоўных. Сістэматычна выконвае норму на 130—140 процантаў.

Па-стаханаўску працуюць на заводзе работніцы Люба Чырвонік, Валенціна Кунцэвіч, Марыя Лавік, Марыя Базылевіч і іншыя.

За датэрміновае выкананне вытворчага плана 1940 года і высокую прадукцыйнасць працы нарком прамысловасці будаўнічых матэрыялаў СССР узнагародзіў восем чалавек з калектыва значком «Отличнику социалистического соревнования» і сем чалавек—пахвальнай граматай наркамата. Сярод узнагароджаных—Вера Вераціла і адкатчыца ваганетак Ольга Веселік.

К. Сергіеня.

Валкавыскі раён.

На Аршанскім ільнокамбінаце (Віцебская абласць). Лепшая ткачыха-стахановка Е. Варанецкая, перайшоўшы на абслугоўванне 16 станкоў, штодзённа выконвае норму на 106 процантаў, прадукцыю дае высокай якасці.
Фота Н. Бутрымовіча (БЕЛТА).

На адказнай рабоце

Нядаўна мяне вылучылі на работу загадчыка аддзелам сацыяльнага забеспячэння раённага Совета дэпутатаў працоўных. Каб я—бедная вясковая дзяўчына ды была на адказнай рабоце—аб гэтым не думала не толькі я, але і мае аднавяскоўцы. А на справе вышла так, што пры совецкай уладзе ператварылася ў жыццё тое, аб чым нават ніколі і не марыў.

Работа для мяне спачатку была незнаёмай, але я ведала адно, што ў кожнай справе перш за ўсё, трэба ўважліва адносіцца да людзей. У наш аддзел паступае многа заяў. Я імкнуся кожную разабраць як след, своечасова адказаць на яе пісьмом, а, калі трэба, аказаць дапамогу.

Нядаўна да мяне звярнулася старэнькая бабуля Сцепаніда Марозава. Яна прасіла аказаць ёй дапамогу. Я ўстроіла яе ў дом для прастарэлых. Трох дзяцей-сірот мы аддалі на выхаванне ў калгас імені Варашылава. Аказана дапамога некаторым калгаснікам праз касу ўзаемадапамогі.

Мяне выбралі дэпутатам райсовета. Я імкнуся заўсёды трымаць сувязь з сваімі выбаршчыкамі.

Ляхавічы. **В. Юруць.**

Цэх трымаю ў чыстаце

У карамельным цэху больш чым у іншых скапляецца пыл. Тут вытвараецца дражыроўка цукеркавай карамелі. Калі своечасова не прыбраць, то цукровы пыл псуе гатовую прадукцыю. Роля прыбіральшчыцы на гэтым участку велізарная.

На фабрыцы я працую 8 месяцаў, але ў гэты цэх мяне перавялі нядаўна. У цэху было брудна. Па кутках, на столі, сценах і вокнах ляжаў пыл. Рэдка прачышчалі вентыляцыю. У першыя дні маёй работы я ўсюды навяла парадак. Цяпер я стараюся не запускаць уборку. Рабочы дзень мой поўнасцю загружан. Мае прылады—трапка і вядро з гатаванай вадой заўсёды са мной, бо не паспееш выцерці і прыбраць адзін бок цэха, пыл з'яўляецца ў другім месцы.

У канцы дня я прыбіраю катлы, дзе дражыруюцца цукеркі з тым, каб другая змена пачала працаваць у чыстым цэху. У цэх я прыходжу раней на 10—15 мінут да пачатку работы змены. Аглядаю ўсё абсталяванне, калі трэба дадаткова праціраю вокны, падлогу, катлы.

Калі на фабрыцы выходны дзень, я раблю генеральную ўборку, перамываю ўсё абсталяванне, прачышчаю вентыляцыю. Потым я маю выходны дзень.

Нас, прыбіральшчыц азнаёмілі з матэрыяламі XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Я памятаю, што чыстата ў цэху садзейнічае палепшанню ўсёй работы, павелічэнню нормы выпрацоўкі. Буду старацца, каб у нашым цэху было заўсёды чыста, бо ад маёй работы таксама залежыць выкананне плана на фабрыцы.

М. Шынкарова, прыбіральшчыца-стаханаўка кандзіцерскай фабрыкі «Х Октябрь»

Магілеў.

Павялічым даход ад жывёлагадоўлі

Кал. Варановіч Юстыну просяць расказаць аб Маскве, яна звычайна гаворыць:

— Расказаць... Усёроўна таго ніяк не раскажаш, што там прышлося бачыць. І словы, нават, цяжка знайсці... Ого, Масква...

Потым ужо Юстына пачынае расказваць павольна, стараючыся знайсці больш трапнае слова і ўспомніць ўсё да дробязі.

На долю Юстыны выпала шчасце быць удзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, пабываць у любімай усім працоўным чалавецтвам Маскве. І гэтага яна ўпаўне заслужыла.

З першых дзён работы ў калгасе Юстына звярнула на сябе ўвагу, як жанчына добрасумленная, працавітая. І таму яе паважаюць. Мясцовае насельніцтва выбрала яе засядацелем народнага суда.

Тры годы таму назад праўленне калгаса «Звязда», Жажэлкаўскага сельсовета, даручыла Юстыне даглядаць цялят. Калі бралася за гэту работу, крыху палохалася, бо яна ведала, якую вялікую адказнасць будзе несці перад калгаснікамі.

Юстына часта, нават, начамі бывае на ферме, даглядае нованароджаных цялят. І не дзіва, што за ўсе годы работы на ферме ў Юстыны не загінула ні адно цяля. Іх яна выгадавала нямала: за першы год—25, за другі—31, за трэці-ж, яшчэ далёка няпоўны год, маецца ўжо 21 цяля.

За стаханаўскую работу на ферме тав. Варановіч некалькі разоў прэміравалі. Нядаўна на агульным сходзе калгаснікаў яна заявіла:

— Пастанова партыі і ўрада аб дадатковай аплаце працы калгаснікаў абавязвае мяне працаваць яшчэ лепш. Я даб'юся таго, што ні адно цяля не будзе ніжэй сярэдняй упітанасці.

І гэта будзе так, бо словы Юстыны ніколі не разыходзяцца са справай.

Ів. Сіняўскі.

Смалявіцкі раён, калгас „Звязда".

Урач Готсбан

Да ліку ўрачоў, якія карыстаюцца аўтарытэтам і павагай сярод наведвальнікаў, адносіцца Хая Майсееўна Готсбан. У 1937 годзе, па сканчэнні Медыцынскага інстытута, яна была накіравана ў мястэчка Высачаны, Лёзненскага раёна. З таго часу і пачынаецца яе практычная працоўная дзейнасць.

Хая Майсееўна ніколі не лічылася з часам і са сваёй працай. Выключна многа ўвагі ўдзяляла і ўдзяляе хворым. Не абмяжоўваецца яна работай толькі ў амбулаторыі. Часта ўначы, а таксама і ў дрэннае надвор'е, выязджае па выкліку ў раён.

У часе вызвалення Заходняй Беларусі ад белапалякаў т. Готсбан была прызвана ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Там яна сябе праявіла як верная дачка радзімы. Пасля дэмабілізацыі тав. Готсбан прызначана раённым урачом паліклінікі імені Леніна горада Віцебска.

Гэта паліклініка абслугоўвае насельніцтва не толькі горада. Тут часта бываюць людзі з мястэчка Высачаны, дзе раней працавала тав. Готсбан. Усе яны хочуць папасці на прыём к Хае Майсееўне і ад душы дзякуюць ёй за аказаную дапамогу.

А. Касімоўская.

Віцебск.

У дзіцячай кансультацыі № 2, лепшай у г. Віцебску. На здымку: грамадзянка П. І. Федотава-Арэхаўская са сваёй дачкой Тамарай на прыёме ў урача В. І. Пінчук. Фото І. Лосева (БЕЛТА).

50 новых узораў прадметаў шырокага спажывання з гліны выпускае Семячыцкі ізразцова-плітачны завод № 12 (Брэсцкая вобласць). На здымку: мастак завода Я. Рудзінская за расфарбоўкай чарнільнага прыбора. Фото В. Лупейка (БЕЛТА).

Асвайваем новы асартымент

Наша трыкатажна-ткацкая арцель імені Крупскай правяла вялікую работу па ажыццяўленню пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па павелічэнню вырабу тавараў шырокага спажывання і харчавання з мясцовай сыравіны». З адыходаў асвоен асартымент дзіцячых рукавіц дашкольнага і школьнага ўзросту.

Гэты асартымент асвоілі стаханаўкі арцелі Серпінская, Казакевіч і Ульянская. Яны выконваюць норму на 150—200 процантаў. Прадукцыю даюць добрай якасці.

Асвоен таксама асартымент шоўкавых кашнэ, якіх будзе выпушчана дзве тысячы штук. Устаноўлен станок для выпрацоўкі салфетак прыгожага ўзору.

Адкрыт цэх хімічнай чысткі і афарбоўкі мужчынскай, жаночай і дзіцячай вопраткі. На многа павялічыцца выпрацоўка дзіцячых вязаных касцюмчыкаў і плаціц.

У гэтым годзе намецілі пабудаваць новую «амерыканку» па хімічнай чыстцы, адкрыць дадаткова чатыры пункты па рамонту трыкатажных вырабаў, асвоіць выпрацоўку бумазеі.

Ф. Маргаўцова.

Магілеў.

Запіскі кавалерыст-дзяўчыны Надзежды Дуравай[1]

— Колькі год вам? Як ваша прозвішча?

— Мне семнаццаты год, прозвішча маё Дураў.

Ротмістр памаўчаў, але потым звярнуўся да мяне:

— Згодзен верыць вашаму слову, Дураў! Спадзяюся, што вы апраўдаеце маю даверанасць вашымі паводзінамі.

Я падзякавала ротмістра і сказала, што маю свайго каня і жадала-б на ім служыць, калі можна.

— Нельга,—сказаў ротмістр.—Вам дадуць казённага; аднак вы можаце трымаць яго пры сабе да таго часу, покуль знойдзецца выпадак прадаць.

— Прадаць! Алкіда!—ускрыкнула я мімаволі.—Не, пан ротмістр, у мяне ёсць грошы, я буду карміць свайго каня на свой кошт і ні для чаго на свеце не расстануся з ім.

Казімірскі сам быў ад калыскі кавалерыстам. Яму вельмі падабалася мая прывязанасць да найлепшага таварыша ў ваенны час. Ён сказаў, што конь мой будзе мець месца на яго канюшні і разам корм, што я магу на ім ехаць за граніцу і што ён бярэцца выхадайнічаць мне дазвол служыць на ім.

Пасля гэтага ён загадаў паслаць да сябе аднаго ўлана і аддаў мяне яму ў догляд, загадаўшы вучыць мяне маршыраваць, рубіцца, страляць, валодаць пікай, сядлаць, рассёдлываць, уючыць і чысціць каня, і калі я некалькі навучуся ўсяму гэтаму, тады абмундзіраваць і ўжываць на службу. Улан, выслухаўшы загад, адразу-ж узяў мяне з сабой у «зборню» (так называецца хата, а часамі хлеў, дзе вучаць маладых салдат усяму, што належыць да службы).

ВУЧЭННЕ

Кожны дзень устаю я на досвітку і адпраўляюся ў зборню, адтуль усе разам ідзем у канюшню.

Улан мой хваліць маю панятлівасць і заўсёдашнюю гатоўнасць займацца практыкаваннямі, хаця-б гэта было з раніцы да вечара. Ён гаворыць, што я буду малайчынай. Трэба, аднак-жа, прызнацца, што я стамляюся смяртэльна, размахваючы цяжкай пікай—асабліва пры гэтым ні на што не прыгодным манеўры вярцець ёю над галавой; і я ўжо некалькі разоў ударыла сябе па галаве. Таксама не зусім спакойна дзейнічаю шабляй; мне ўсё здаецца, што я парэжуся ёю; аднак, я хутчэй гатова параніць сябе, чым паказаць малейшую баязлівасць.

Правёўшы ўсю раніцу на вучэнні, абедаць іду да Казімірскага. Ён экзамянуе мяне з бацькоўскай ласкай, пытаецца, ці спадабаюцца мне маі цяперашнія заняткі, і якім я знаходжу ваеннае рамяство?

Я адказвала, што люблю ваеннае рамяство з дня майго нараджэння; што заняткі ваяўнічыя былі і будуць адзіным маім практыкаваннем, што лічу званне воіна благароднейшым з усіх і адзіным, у якім нельга дапускаць ніякіх парокаў, таму што неўстрашымасць ёсць першая і неабходная якасць воіна; з неўстрашымасцю неразлучна веліч душы, і пры спалучэнні гэтых двух вялікіх вартасцей няма месца парокам ці нізкім страсцям.

Пасля абеда Казімірскі клаўся спаць, а я ішла ў канюшню даць каню паўднёвую яго порцыю аўса. Пасля гэтага я была свабодна рабіць, што хочу, да шасці гадзін вечара.

Колькі ні бываю я стомлена, размахваючы цэлую раніцу цяжкай пікай—сястрою шаблі, маршыруючы і прыгаючы праз бар'ер, але за поўгадзіны адпачынку стомленасць мая праходзіць, і я па некалькі гадзін хаджу па палях, гарах, лясах, бясстрашна, бесклапотна і без утомы. Свабода—каштоўны дар неба—зрабілася, нарэшце, лёсам маім назаўсёды. Я ею дыхаю, цешуся, яе адчуваю ў душы, у сэрцы. Я шчаслівая пры думцы, што я магу хадзіць, не даючы нікому справаздачы і не апасаючыся ні ад каго забароны. Я прыгаю ад радасці, уяўляючы, што ва ўсім жыцці маім не пачую больш слова: «Ты—дзеўка, сядзі, табе непрыстойна хадзіць адной прагульвацца».

Увы, колькі прыгожых, ясных дзён пачалося і скончылася, на якія я магла толькі глядзець заплаканымі вачыма скрозь акно, каля якога матушка загадвала мне плясці карункі.

Я заўсёды бываю сумнай, калі ўспамінаю аб сваім хатнім жыцці. Але, к шчасцю, з кожным днём успамінаю аб ім радзей, і толькі адна думка, што волі маёй, як позірку, няма межаў, кружыць радасцю маю галаву.

* * *

Больш трох тыдняў стаім мы тут. Мне далі мундзір, шаблю, піку, такую цяжкую, што яна мне здаецца бервяном; далі шарсцяныя эпалеты, каску з султанам, белую перавязь з падсумкам, напоўненым патронамі; усё гэта вельмі чыста, вельмі прыгожа і вельмі цяжка. Да чаго цяжэй за ўсё прызвычаіцца, дык гэта да тыранскіх казённых ботаў. Яны як жалезныя. Да гэтага часу я насіла абутак мяккі і лоўка пашыты; нага мая была лёгкай і свабоднай. А цяпер! Я быццам прыкавана да зямлі цяжарам маіх ботаў і велізарных брынчачых шпораў. Аднак-жа я спадзяюся прызвычаіцца і да іх.

. . . . . .

Мы ідзем за граніцу. У бітву. Я так рада і так смуткую. Калі мяне заб'юць, што будзе з старым бацькам маім. Ён любіў мяне.

Праз некалькі гадзін я пакіну Расію і буду ў чужой зямлі. Я пішу бацьку, дзе я і што я цяпер. Пішу, што, падаючы к стапам яго і абнімаючы яго калена, умаляю дараваць мне пабег мой, даць благаслаўленне і дазволіць ісці шляхам, неабходным для майго шчасця..

Слёзы мае падалі на паперу, калі я пісала, і яны будуць гаварыць за мяне бацькоўскаму сэрцу.

Толькі што я аднесла пісьмо на пошту, як нам загадалі выводзіць коней. Мы зараз-жа выступаем. Мне дазваляюць ехаць, служыць і ваяваць на маім Алкідзе. Мы ідзем у Прусію.

ПЕРШАЯ БІТВА

У першы раз бачыла я бітву і была ў ёй. Як многа пустога нагаварылі мне аб першай бітве, аб страху, палахлівасці і, нарэшце, адважнай мужнасці. Якое глупства!

Адбывалася бітва ў горадзе Гутштадце. Полк наш некалькі разоў хадзіў у атаку, але не разам, а паэскадронна. Мяне лаялі за тое, што я з кожным эскадронам хадзіла ў атаку. Але гэта, права, было не ад злішняй храбрасці, а проста ад няведання; я думала—так трэба, і вельмі здзіўлялася, што вахмістр чужога эскадрона, каля якога я неслася, як віхор, крычаў на мяне: «Ды праваліся ты адсюль! Для чаго ты тут скачаш?» Але я не магла вярнуцца. Грозны і велічны гул гарматных стрэлаў, рыканне ці нейкае раскатанне ляцячага ядра, скачучая коніца, бліскучыя штыкі пяхоты, барабанны бой і цвёрды крок і спакойны выгляд, з якім пяхотныя палкі нашы ішлі на ворага,—усё гэта напаўняла душу маю такімі адчуваннямі, якіх я ніякімі словамі не магу выказаць.

Ледзь было я не пазбавілася майго каштоўнага Алкіда: раз'язджаючы, як я ўжо сказала, паблізу свайго эскадрона і разглядаючы цікавы малюнак бітвы, убачыла я некалькі чалавек непрыяцельскіх драгунаў, якія, акружыўшы аднаго рускага афіцэра, збілі яго выстралам з пісталета з каня. Ён упаў, і яны хацелі рубіць яго ляжачага. У тую-ж мінуту я панеслася да іх, трымаючы піку наперавес. Трэба думаць, што гэта сумазбродная адвага спалохала іх, таму што яны зараз-жа пакінулі афіцэра і рассыпаліся паасобку. Я прыскакала да раненага і астанавілася над ім. Мінуты дзве глядзела я на яго моўчкі. Ён ляжаў з закрытымі вачыма, не падаючы адзнак жыцця, відаць, думаў, што над ім стаіць непрыяцель.

Нарэшце, ён адважыўся глянуць, і я зараз-жа запыталася, ці не хоча ён сесці на майго каня?

— Ах, зрабіце міласць, друг мой, сказаў ён ледзь чутным голасам.

Я зараз-жа сышла з каня і з цяжкасцю падняла раненага, але тут і скончылася мая паслуга; ён упаў да мяне на руку грудзьмі, і я, ледзь трымаючыся на нагах, не ведала, што мне рабіць і як пасадзіць яго на Алкіда, якога таксама трымала за повад другой рукой. Такое становішча скончылася-б вельмі сумна для нас абодвух, але, на шчасце, да нас пад'ехаў салдат і дапамог мне пасадзіць раненага на майго каня. Салдат сказаў мне, што выратаваны мной афіцэр—паручык Панін, і абяцаў прыслаць мне каня назад у Каннапольскі полк.

З гэтымі словамі ён павёз афіцэра да яго палка, а я пайшла да свайго

[1] Прадаўжэнне; пачатак глядзі ў № 4, 5, 6.

Я адчувала сябе ў вельмі нявыгадным становішчы, застаўшыся пехатой сярод скачкі, страляніны, рубкі на шаблях, і вельмі раскайвалася, аддаўшы так безрассудна свайго каня, тым больш, што мой ротмістр, спачатку з удзелам запытаў быў мяне: «Твайго каня забілі, Дураў? Ці не ранен ты?—але, даведаўшыся, як гэта здарылася, што я хаджу пехатой, з дасадай ускрыкнуў на мяне:—Пайшоў за фронт, павеса!»

Хоць са смуткам, але спяшаючыся ішла я да таго месца, дзе бачыла флюгеры пік Коннапольскага палка.

Сустракаўшыеся з жалем гаварылі: «Ах, паглядзіце, які малады хлопчык ранен!» Інакш ніхто не мог думаць, бачачы ўлана пехатой у залітым крывёю мундзіры. Я ўжо сказала, што ранены афіцэр ляжаў грудзьмі на руцэ ў мяне, і трэба меркаваць, што рана яго была на грудзях, таму што ўвесь мой рукаў быў у крыві.



Я панеслася да іх, трымаючы піку наперавес.

Да невытлумачальнай радасці маёй Алкід звернут мне, хоць і не так, як я спадзявалася, але ўсё-ж звернут. Вечарам таго-ж дня я ўбачыла яго ў паручыка нашага палка, падбегла да яго і пачала гладзіць і лашчыць Алкіда, які таксама выказаў радасць сваю прыжком і гучным іржаннем.

— Няўжо гэта твой конь?—запытаў здзівіўшыся паручык.

Я расказала яму сваё здарэнне.

Паручык таксама не пахваліў маёй лёгкадумнасці і сказаў, што купіў майго каня ў казакаў за два чырвонца. Я прасіла аддаць мне яго назад і ўзяць ад мяне заплочаныя ім грошы.

— Добра, але на сёння пакінь яго ў мяне. Каня майго забілі і мне няма на чым быць у справе.—Сказаў, даў шпоры майму Алкіду і паскакаў на ім. А я, я толькі што не плакала, бачачы майго ратнага таварыша ў чужых руках. Я атрымала свайго каня з адным толькі сядлом, а ўсё астатняе прапала. Казакі, злавіўшыя майго Алкіда, знялі з яго саквы з сухарамі, плашч і чамадан.

Я не ела больш паўтара сутак, і ногі ледзь трымаюць мяне. Так як нам загадана стаяць на месцы, я прылегла ў кустах і заснула, але была вельмі хутка і непрыемна разбуджана: паблізу мяне ўпала ядро, услед за ім праляцела яшчэ некалькі. Я ўскочыла і адбегла крокаў дзесяць ад гэтага месца. Але шапка мая там асталася, я не паспела схапіць яе. Яна ляжала на траве, і на цёмнай зелені яе была падобна на велізарную кветку па свайму яркаму малінаваму колеру. Вахмістр загадаў мне ісці ўзяць яе, і я пайшла, хоць і не зусім ахвотна, таму што ядра густа і бесперапынна падалі ў гэты хмызняк.

Неўзабаве высветлілася прычына гэтай нечаканай пальбы па нас. Віной былі нашы флюгеры. Мы ўваткнулі пікі ў зямлю пры конях. Разнакаляровыя флюгеры, гуляючы з ветрам і трапечучы ў паветры, прыцягнулі ўвагу непрыяцеля. Угадваючы па іх нашу прысутнасць у гэтым лясочку, ён накіраваў туды свае гарматы.

Цяпер нас адвялі далей, і пікі загадана пакласці на зямлю.

Вечарам палку нашаму загадана быць на конях.

Да глыбокай ночы сядзелі мы на конях і чакалі, калі нам загадаюць рушыцца з месца. Стаміўшыся смяротна сядзець на кані так доўга, я рашыла трохі адпачыць. Перавёўшы Алкіда праз маленькі роў, я легла ў кустах. Я абкруціла повад вакол рукі і зараз-жа заснула.

Раптам чую імя сваё, некалькі разоў паўторанае. Адчуваю, што Алкід штурхае мяне галавой, хрыпіць і б'е капытом у зямлю; чую, што зямля задрыжэла пада мной, і потым усё сціхла. Сэрца маё замірала, я разумела небяспечнасць, сілілася прачнуцца і—не магла... Алкід мой! Бясцэнны конь! Хаця застаўся адзін, чуў здалёку сваіх таварышоў, быў на свабодзе, таму што повад аслабеў і ўпаў з рукі маёй, не пайшоў аднак ад мяне, але толькі бесперапынна біў капытом зямлю і хрыпеў, нахіляючы да мяне морду. З цяжкасцю, нарэшце, адкрыла я вочы, устала; гляджу на месца, дзе стаяў полк,—яго няма. Я абкружана цемрай і маўклівасцю ночы, такой страшнай у цяперашнім выпадку.

Дрыжачы ад хвалявання і холада, я паспяшыла сесці на Алкіда. Ад лёгкага дакранання нагі конь мой пусціўся ўскач. Я даверылася інстынкту Алкіда.

Ноч была такой цёмнай, што і на дваццаць крокаў нельга было добра бачыць прадметаў. Я апусціла павады. Алкід хутка перастаў галапіраваць і пайшоў шагам, бесперапынна храпучы і водзячы вушамі. Цемра так згусцілася, што я зусім ужо нічога не бачыла перад сабою, не разумела, куды еду і які канец будзе гэтаму падарожжу. Покуль я думала і перадумвала, што мне рабіць, Алкід пачаў спускацца раптам з такой страшэннай кручы, што тут ужо некалі было раздумваць. Для захавання галавы сваёй, я хутка саскочыла з каня і павяла яго ў руках, нахіляючыся амаль да зямлі, каб бачыць, дзе ставіць нагу, і прымаючы ўсе перасцярогі, неабходныя пры такім небяспечным спуску. Калі мы з Алкідам сталі, нарэшце, на роўным месцы, я ўбачыла на вялікай адлегласці ад нас мноства агней і амаль побач мяне вялікую дарогу; за мной рэдут, на які Алкід узбіраўся і з якога я з такім жахам спускалася. Даведаўшыся, нарэшце, дзе я знаходжуся, і мяркуючы, напэўна, што бачаныя мной агні разведзены нашай арміяй, я села зноў на свайго каня і накіравала шлях свой па дарозе да агней прама супроць мяне, але Алкід звярнуў улева і пайшоў сам сабою ў галоп. Тады я павярнула яго зноў на дарогу. Конь паслухаўся з прыкметным нежаданнем і пайшоў шагам, усё стараючыся аднак-жа прыняць улева. Праз некалькі мінут я пачула тупат многіх коней, галасы людзей і, нарэшце, убачыла едучы прама да мяне натоўп конных. Я ўзрадвалася, мяркуючы, што цяпер даведаюся, дзе агні Коннапольцаў. Калі яны пад'ехалі да мяне блізка, то той, што ехаў уперадзе, запытаў мяне:

— Хто гэта едзе?

Я адказвала:

— Коннаполец.

— Куды-ж ты едзеш?

— У полк.

— Але полк твой стаіць вунь там,—сказаў коннік, указваючы рукой у той бок, у які мой верны Алкід так узмоцнена стараўся звярнуць,—а ты едзеш прама да непрыяцеля.

Сказаўшы гэта, конныя паскакалі далей, а я, пацалаваўшы некалькі разоў вушка неацанімага майго Алкіда, аддала яму на волю выбіраць дарогу. Адчуўшы свабоду, верны конь узвіўся ад радасці на дыбы, заіржаў і паскакаў прама да агней, якія свяціліся ў левым баку ад дарогі. Дзякуючы быстрыні Алкіда, у чвэрць гадзіны я была дома, г. зн. у палку. Коннапольцы былі ўжо на конях; Алкід мой з нейкім ціхім, прыязным іржаннем змясціўся ў свой ранжыр і толькі што паспеў устанавіцца, раздалася каманда: «Справа па тры марш!» Таварышы аднаго са мной аддзялення ўзрадаваліся майму звароту; многія лічылі мяне загінуўшай. Але вахмістр, даведаўшыся, як была справа, палічыў абавязкам палаяць мяне:

— Ты робіш глупствы, Дураў. Табе не знасіць дабром галавы сваёй. Пад Гутштадтам, у самым пылу бітвы, уздумаў аддаць свайго каня нейкаму раненаму... Няўжо ты не меў розума зразумець, што кавалерыст пехатой сярод бітвы—самае загінуўшае стварэнне. Цяпер ты зышоў з ка-

ня і лёг спаць у кустах, тады як увесь полк з мінуты на мінуту чакаў загада ісці, і ісці на рысях. Што-ж бы з табою было, калі-б ты не меў каня, які, не ў гнеў табе сказаць, значна цябе разумней... Салдат павінен быць больш чым чалавек. У гэтым званні няма ўзросту. Абавязкі яго павінны быць выконваемы аднолькава як у 17 год, так у 30 і 80 год. Раю табе паміраць на кані і ў сваім ранжыры, а то прадракаю табе, што ты ці пападзешся бясслаўна ў палон, ці будзеш забіт марадзерамі, ці, што ўсяго горш, будзеш залічан за труса.

Вахмістр замаўчаў; але апошняя фраза яго жорстка ўкалола мяне. Уся кроў кінулася мне ў твар.

* * *

З самай раніцы ідзе моцны дождж; я дрыжу—на мне нічога ўжо няма сухога. Бесперашкодна ллецца дажджавая вада на каску, скрозь каску на галаву, па твары за шыю, па ўсяму целу, у боты, перапаўняе іх і цячэ на зямлю некалькімі ручаямі. Я дрыжу ўсімі членамі, як асінавы ліст.

Не гледзячы на мудраванні вахмістра нашага аб абавязках салдата, я падала ад стомленасці. Я адчувала, што сілы мае слабнуць з кожнай гадзінай. Двое сутак я амаль не спала і не ела, мокла ў адным мундзіры (бо шынель мая была ўзята казакамі з Алкіда разам з сухарамі і чамаданам), безабаронна падвержаная халоднаму ветру і дажджу. Мы ішлі справа па тры, але калі здараўся мосцік або якая іншая цяжкасць, перашкаджаўшая праходзіць аддзяленнямі, тады ішлі па два ў рад, а часамі і па аднаму. У гэтым выпадку нашаму ўзводу прыходзілася стаяць па некалькі мінут нерухома на адным месцы. Пры кожным такім дабрадзейным прыпынку я хутка зыходзіла з каня, клалася на зямлю і ў шляху секунду засынала. Узвод рушыўся з месца, таварышы крычалі, клікалі мяне, я зараз-жа прасыналася, уставаала і карабкалася на Алкіда, цягнучы за сабой цяжкую дубовую піку. Сцэны гэтыя аднаўляліся пры кожнай астаноўцы; я вывела з цярплівасці свайго унцер-афіцэра і раззлавала таварышоў. Усе яны сказалі мне, што кінуць мяне на дарозе, калі я яшчэ хоць раз сыйду з каня.

— Аднак-жа ты бачыш, што мы дрэмлем, ды не ўстаем-жа з коней і не кладземся на зямлю; рабі і ты так.

Вахмістр бурчэў упоўголаса:

— Навошта гэтыя шчаняты лезуць у службу. Сядзелі-б у гняздзе сваім.

Астатні час пераходу я аставалася ўжо на кані.

Нарэшце, мы спыніліся. Нам дазволілі развесці агонь і зварыць кашу. Цяпер я лягу спаць перад агнём, сагрэюся і высахну.

— Нельга,—гаворыць вахмістр, убачыўшы мяне, што я ўселася ля агню і згортваю ў камяк траву, каб пакласці пад галаву,—нельга. Ротмістр загадаў карміць коней на траве. Вынь цуглі з роту свайго каня і вядзі яго на траву.

Я пайшла з маім Алкідам хадзіць у поле, як і іншыя. Ён еў расістую траву, і я сумуючы стаяла ля яго.

Нарэшце, бачачы, што коні насуцца спакойна і ўланы спяць на лузе, я не знаходзіла ніякай патрэбы не спаць адна. Было ўжо больш поўдня, сонца стаяла высока, зрабілася горача, і мундзір мой высах. Я сыйшла на бераг ракі, якая працякала паблізу нашага стана, і легла ў высокую траву спаць. Алкід хадзіў непадалёку ад мяне.

Глыбокі сон быў перарван крыкам: «Муштуч! Сядай!» і тупатам бягучых уланаў да коней і з коньмі к фронту. Я ўскочыла хутка. Стомленасці як не бывала. Я адчувала сябе зноў моцнай і бадзёрай. Вахмістр быў ужо на кані і прыспешваў улан строіцца. Шукаю вачыма Алкіда і, к жаху маёму, бачу яго плывучым праз раку прама да другога берага. У гэты час вахмістр падскочыў да мяне: «Ты што стаіш без каня?» Некалі было вагацца, я кінулася ўслед за Алкідам у ваду, і абодва разам мы выйшлі на процілеглы бераг. У адну мінуту я замуштучыла, села, пераплыла назад і стала ў сваё месца перш, чым эскадрон зусім пастроіўся.

— Ну, па крайняй меры, маладзецкі паправіўся,—сказаў вахмістр з задаволеным выглядам.

(Прадаўжэнне ў наступным нумары)

Ці так трэба даглядаць дзяцей?

Дзеці рабочых гваздзільнага завода «Чырвоны Окцябр» знаходзяцца ў яслях на тэрыторыі Баранскага сельсовета. Многія мацеры скардзяцца, што дзяцей у гэтых яслях дрэнна даглядаюць. Скаргі гэтыя зусім правільныя.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што ў яслях брудна. У пакоях, дзе знаходзяцца дзеці, уборка робіцца павярхоўна. На столі, у кутках павуціна. Пялёнкі і ўся пасцельная бялізна брудная. Дзіцячая хатняя вопратка ляжыць у адной агульнай шафе, а то і на ложках дзяцей. Некаторыя мацеры забіраюць дзяцей да дому у ясельнай вопратцы.

Пры яслях няма пральні. Бялізну мыюць у агульным пакоі, дзе гуляюць дзеці. Абслугоўваючы персанал ходзіць у парваных халатах, а іншы раз бывае і без халатаў. Выхавацельніцы груба абыходзяцца з дзецьмі. На свежае паветра дзяцей не выносяць. Цацак у яслях ніякіх няма.

Плата за дзяцей бярэцца няправільна. Работнікі ясляў за сваіх дзяцей плацяць па 12 рублёў. Вось загадчыца тав. Буевіч павінна плаціць 45 рублёў у месяц, санітарка Гурчэнкова 25 рублёў, тэхнічка Чыкова 17 рублёў, а ўсе яны плацяць па 12 рублёў.

Мы неаднаразова звярталіся ў райздраў за дапамогай, пісалі туды, аб тым, што нашых дзяцей у яслях выхоўваюць дрэнна.

М. Мацулевіч.

Аршанскі раён.

Ад рэдакцыі:

Пры выездзе на месца ўказаныя факты аб дрэннай рабоце ясляў, абслугоўваючых дзяцей рабочых завода «Чырвоны Окцябр», поўнасцю пацвердзіліся. У рабоце ясляў маюцца вялікія недахопы. Абслугоўваючы персанал (загадчыца тав. Буевіч) дрэнна адносіцца да сваіх абавязкаў.

Нельга не ўказаць на тое, што дрэннай рабоце ясляў садзейнічаюць дразгі паміж старшынёй сельскага Совета дэпутатаў працоўных тав. Пахоменка і грамадскімі арганізацыямі завода. Тав. Пахоменка лічыць, што раз яслі знаходзяцца на тэрыторыі сельскага Совета, то ён адзін мае права ўмешвацца ў іх работу, а грамадскія арганізацыі завода—заводскі камітэт, партыйнае бюро—не павінны займацца гэтым пытаннем.

Характэрны такі факт. Заводскі камітэт рашыў на сваім пасяджэнні 19 сакавіка заслухаць інфармацыю загадчыцы яслямі тав. Буевіч. Ёй было паслана загадзя паведамленне, што заўком просіць прыйсці на пасяджанне і зрабіць справаздачу аб рабоце ясляў.

— Без. майго ведама не маюць права гэтага рабіць,— заўпарціўся тав. Пахоменка і на паведамленні напісаў рэзалюцыю: «Старшыні заводскага камітэта. Аб усякіх справаздачах, непадпарадкаванай вам установы, трэба даводзіць да ведама сельскі Совет». На пасяджэнне заўкома тав. Буевіч не з'явілася.

Заводскія арганізацыі з свайго боку таксама ўдзяляюць рабоце ясляў выключна мала ўвагі. А дырэктар завода тав. Андронаў нават заявіў, каб аб рабоце ясляў з ім і не гутарылі.

Неабходна, каб Аршанскі раённы аддзел аховы здароўя заняўся работай гэтых ясляў і навёў у іх парадак.

Вучыся аказваць ПЕРШУЮ ДАПАМОГУ

Замест жгута можна карыстацца падручным матэрыялам, напрыклад, тоўстай вяроўкай ці тоўстым шнуром, якія туга закручваюцца пры дапамозе прадзетай палкі, ці доўгага цвіка. Жгут прымяняецца галоўным чынам пры крывяцячэннях з ран канечнасцей.

Накладваючы жгут, захоўвайце наступныя правілы: для папярэджання ад пашкоджання скуры, мяккіх тканей і нерваў месца, на якое будзе накладвацца жгут, завёртваюць бінтом, марляй, касынкай і т. п. Пры крывяцячэннях з ран верхніх канечнасцей жгут накладваецца на верхнюю трэць пляча, пры крывяцячэнні з ран ніжніх канечнасцей—у верхняй палавіне бядра. (У гэтых месцах з унутранага боку артэрыі прыціскаюць рукамі). Жгут павінен зацягвацца да таго часу, пакуль крывяцячэнне не спыніцца (пульс ніжэй жгута прападае). Калі пасля налажэння жгута канечнасць сінее і крывяцячэнне не спыняецца, жгут накладзен недастаткова туга. Нельга зацягваць жгут і празмерна туга—можна пашкодзіць мяккія ткані і нервы. Жгут не павінен заставацца на канечнасці больш 1½—2 гадзін. У выпадку неабходнасці трымаць жгут больш доўгі час трэба на некалькі мінут аслабляць яго, а затым зноў зацягваць. У халодную пару года канечнасць з наложаным жгутам трэба закутаць пацяплей.

Крывяцячэнні пры самаадвольных разрывах расшыраных вен ніжніх канечнасцей спыняюцца давячай павязкай.

Пры вялікіх стратах крыві пацярпеўшага трэба пакласці з нізка апушчанай галавой і прадаставіць яму спакой.

АПЁКІ

Апёкі адрозніваюцца па ступені пашкоджання. Пры апёку першай ступені апечанае месца чырванее і прыпухае, рэзка хваравітае. Пры апёках другой ступені на апаленым месцы паяўляюцца пузыры рознай велічыні. Пры апёках трэцяй ступені робіцца струп, і пры вельмі цяжкіх апёках можа быць абвугліванне тканей.

Цяжкасць апёка залежыць не толькі ад ступені пашкоджання, але і ад яго абшырнасці. Апёк большай часткі ўсяго цела прыводзіць да смерці.

Перш чым аказваць дапамогу апечанаму, трэба патушыць гарашчае ці тлеючае адзенне. Тушыць можна вялікай колькасцю вады ці закутваннем пацярпеўшага ў коўдру ці штору.

Пры апёку першай ступені на апечанае месца кладуць павязку са спірта, дэнатурата ці адэкалона. Такая павязка ў першы момант выклікае рэзкае ўзмацненне болю, але затым ён хутка сціхае. Калі пад рукой няма гэтых сродкаў, то апаленае месца можна змазаць моцным растворам марганцава-кіслага калія ці ў крайнім выпадку, несалёным тлушчам. У асобных выпадках хуткае прымяненне спірта і марганцава-кіслага калія папярэджвае ўтварэнне пузыроў.

Пры апёках другой ступені, калі ёсць пузыры, накладваюцца павязкі, прапітаныя ўжо ўказанымі сродкамі. Пузыры пракалваць не трэба. Пры апёках трэцяй ступені трэба накласці на апечанае месца чыстую павязку і звярнуцца за ўрачэбнай дапамогаю. Апаленыя церпяць ад смагі і холада, пагэтаму ім трэба даваць многа гарачага піцця (можна з віном), цёпла ўкутваць і абкладваць грэлкамі. Развязваць пацярпеўшых трэба толькі ў цёплым памяшканні. Не аддзірайце ад скуры прыгарэўшае адзенне. Абрэжце кругом свабодныя краі, а прыстаўшую частку пакіньце не кранутай.

Прысыпанне апаленага месца содай, крухмалам, змазванне масламі ці рознымі тлустымі мазямі перашкаджае далейшаму лячэнню і павінна быць пакінута. Лепшым спосабам аказання першай дапамогі, безумоўна з'яўляецца раствор марганцава-кіслага калія, таму што ён не перашкаджае далейшаму лячэнню. У кожнай хатняй аптэцы заўсёды павінен быць пузырок ці каробачка з крышталямі марганцава-кіслага калія. Пры апёках трэба прымяняць раствор густога вішнёвага колеру.

ПЕРАЛОМ

Аказваючы дапамогу пацярпеўшаму перш за ўсё трэба вызначыць, які ў яго пералом—адкрыты ці закрыты. Калі канцом зламанай косці пашкоджаны мяккія ткані і праз кожную рану відаць аголеная косць,—пералом адкрыты. Ён больш небяспечны чым закрыты, і патрабуе асаблівага асцярожнага абыходжання. Неабходна ў першую чаргу перавязаць ствараўшуюся рану, а затым накласці шынную павязку. Калі пад рукамі няма стэрыльнага перавязачнага матэрыяла і нельга прыкрыць рану чыстай насавой хусткай ці ручніком, то пакіньце яе адкрытай, абараніўшы ад дакранання адзення і рук. Калі не можаце хутка забяспечыць пацярпеўшаму медыцынскую дапамогу на месцы, дастаўце яго ў лячэбную ўстанову. Не трэба спрабаваць самім упраўляць пералом, можна толькі пашкодзіць. Перад перапоскай хворага ў цёплае памяшканне трэба накласці шынную павязку, каб зламаная канечнасць знаходзілася ў пакоі. Шынная павязка можа рабіцца з самых рознастайных прадметаў, якія знаходзяцца пад рукой. Для гэтай мэты нярэдка выкарыстоўваюць палкі ад лыж, галіны, хварасціны, штукатурную дрань, жгуты з трысця і саломы. Прыклаўшы з двух бакоў зламанай канечнасці шыны, іх моцна прыбінтоўваюць і ствараюць нібы знадворны шкілет канечнасці, які замяняе зламаныя косці. Пры пераломе рукі трэба падвесіць яе на шыі з дапамогаю шарфа, ручніка ці касынкі.

ВЫВІХ

Калі пад уплывам знешняй сілы, напрыклад, пры падзенні, пры ўшыбе аўтамабілем і т. д. канцы касцей, утвараючыя сустаў, настолькі змяшчаюцца, што датыканне іх парушана, то адбываецца вывіх. Сустаўная сумка, якая акружае канцы касцей, разрываецца, і ў стварыўшайся адтуліне ўшчымляецца канец касці. Рухі ў суставе пры вывіху становяцца немагчымымі, пацярпеўшы адчувае моцны боль.

Першая дапамога пры вывіху павінна заключацца ў стварэнні спакойнага становішча для пашкоджанага сустава і тэрміновай дастаўцы ў лячэбную ўстанову. Пры гэтым чым хутчэй пацярпеўшы атрымае медыцынскую дапамогу, тым лягчэй будзе ўправіць вывіх.

Упраўленне вывіху павінна рабіцца толькі медыцынскімі работнікамі, тым больш, што часта прыходзіцца рашаць пытанне, ці няма акрамя вывіху і пералому.

Пакойнае становішча для пашкоджанага сустава дасягаецца падвешваннем і прыбінтоўваннем канечнасці (пры вывіху плечавога сустава) ці накладаннем шыннай павязкі.

ВОБМАРАК

Пад уплывам розных прычын (спалох, моцны боль, пераўтамленне) можа адбыцца раптоўная страта сазнання, якая суправаджаецца рэзкай бледнасцю, аслабленнем дыхання і сардэчнай дзейнасці. Вобмарак звычайна прадаўжаецца вельмі кароткі час і не прадстаўляе небяспекі для жыцця. Выклікаецца ён раптоўным малакроўем мазга. Пагэтаму ў пацярпеўшага неабходна перш за ўсё выклікаць прыліў да галавы. Трэба пакласці хворага так, каб галава была як мага ніжэй, і прыпадняць рукі і ногі. Часам гэта бывае зусім дастаткова каб вобмарак скончыўся і хворы прышоў у сябе. Калі ён паранейшаму застаецца ў непрытомнасці, то яму даюць нюхаць раздражняльныя сродкі (нашатырны спірт, нюхацельную соль) ці апырскваюць халоднай вадою.

Доктар А. М. Нечаеў.

[1] Пачатак гл. у № 5, 6.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 49, 2 паверх, комната № 4. Тэл. 24058

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 4229. Тыраж 13.000 экз. УК 5897.

Здана ў друк. 1/IV—41 г. Падпісана да друку 15/IV—41 г. 2½ друк. арк. У нумары 120.140 друк. знак.

ЦАНА 20 кап.

Да гэтага нумару бясплатна дадаецца ўкладка-выкрайка.

037
26/IV 41

Вясна. Каля ракі Свіслач (Мінск).

Фото-эцюд Э. Астрэйка (БЕЛТА)